№ 2 (648) 13 студзеня 2010
www.nn.by
незалежная газета
# Наша Ніва
ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Вочы

палітыкаў, бізнэсоўцаў, інтэлектуалаў, шоуперсонаў...

Старонка 8





### У НУМАРЫ

**Дырэктар, які не пакаяўся**
Былога дырэктара МТЗ пратрымалі за кратамі 8 гадоў. **Старонка 2.**

**Юозас Булька знёс сваю таямніцу з сабою**
Не стала аднаго з самых вядомых беларускіх святароў. **Старонка 2.**

**Крык аб дапамозе альбо нахабны аферызм?**
У некалькіх газетах звярнулі ўвагу на артыкул «Не осудите, а помогите». **Старонка 7.**

**Беларускі і эстонскі ўніверсітэты: я адчуў розніцу**
Студэнт сам вызначае, калі яму зручна праходзіць прадметы. Сам выбірае групу і час практычных заняткаў... **Старонка 7.**

**20 еўра — самая папулярная сярод фальшываманетчыкаў**
Як адрозніць праўдзівыя купюры ад падробных? **Старонка 7.**

**Уладзімір Някляеў. Знакі прыпынку**
Пра Казуліна, Працьку, Танка, Кузняцова, А.А... **Старонка 13.**

# Мірон. Легенда

На Раства 35-гадовы будаўнік Сяргей Каваленка вывесіў вялізны бел-чырвона-белы сцяг на найвышэйшай навагодняй яліне краіны. **Старонка 5.**



«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

## «Зброю возяць вельмі многія»

Зарабляць у Афрыцы? Цалкам рэальна. Але...



**Старонка 6.**

# «Для мяне гэта справа гонару»

Сяргея Каваленку вызвалілі з віцебскага СІЗА прыкладна а 18-й вечара 12 студзеня.

Даволі нечакана — яму абяцалі, што сеў ён надоўга. За лічаныя дні ён стаў нацыянальным героем. Ягоны нібы сечаны твар з'явіўся на дзесятках сайтаў і блогаў.

Па вызваленні з СІЗА Сяргей Каваленка адказаў на пытанні «НН».

**«Наша Ніва»: Сяргей, на якіх умовах вас вызвалілі?**

**Сяргей Каваленка:** На ўмовах падпіскі аб нявыездзе, а таксама добрых паводзін. Пастанову падпісаў выконваючы абавязкі пракурора Кастрычніцкага раёна Галызаў.

**«НН»: А чаму так нечакана?**

**СК:** Думаю, што справа атрымала вялікі рэзананс. Яшчэ ўчора мяне прызначылі дзяжурным па камеры, а сёння вызвалілі. Калі б у СІЗА ведалі пра вызваленне, то дакладна б мяне не прызначалі. Напэўна, прыйшла каманда зверху.

**«НН»: А як вялося следства?**

**СК:** Быў адзін допыт. А таксама вочная стаўка з амапаўцамі, якія мяне затрымлівалі. Я сказаў, што буду размаўляць толькі па-беларуску. Дык следчая сказала, што недастаткова разумее беларускую мову, і ёй патрэбен перакладчык.

**«НН»: А прызналіся, што вывешвалі сцяг?**

**СК:** Вядома! Чаму не прызнавацца? Для мяне гэта справа гонару.

**«НН»: І няцяжка было залезці на ёлку?**

**СК:** Для мяне лёгка і нястрашна.

**«НН»: А як затрымалі?**

**СК:** Калі злазіў з ёлкі, знізу ўжо стаялі двое амапаўцаў. Адразу пачалі збіваць, адзін абяцаў мяне абас...ць.

**«НН»: А чаму ўвогуле вырашылі вешаць сцяг?**

**СК:** Гэта плошча, цэнтр горада. Я лічу, што палітычныя акцыі трэба праводзіць у месцах, дзе шмат людзей. Яшчэ добра вывешваць сцягі на прыпынках. Грамадзяне павінны бачыць апазіцыю не толькі ў газетах і інтэрнэце, а то ў іх складваецца ўражанне, што апазіцыянеры толькі грошы дзеляць.

**«НН»: А якія ўмовы былі ў турме?**

**СК:** Дрэнныя ўмовы. Затое сядзеў разам з добрымі людзьмі. Міліцыянты паводзяць сябе з вязнямі, як са скацінай. Спрабуюць зламаць псіхалагічна.

**«НН»: А што цяпер, які ваш прагноз?**

**СК:** Не ведаю. Думаю, што мая справа будзе вырашацца вышэй, чым у віцебскім судзе. Цяпер мушу з'яўляцца да следчага па позвах.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

Свабода Сяргея Каваленкі — **старонка 5**.

# Юозаса Бульку пахавалі каля касцёла ў Мосары

**Слынны святар памёр на 85-м годзе жыцця пасля паўторнай аперацыі на сэрцы.**

«Колькі ў табе было запалу і актыўнасці, а цяпер ты так ціха ляжыш», — з цеплынёю прамовіў у часе пахавання кардынал Казімір Свёнтак. Ён падзякаваў Богу за 16 гадоў сумеснай працы з кс. Булькам і папрасіў прабачэння перад целам памерлага ад імя ўсіх тых, хто, магчыма, пакрыўдзіў гэтага святара.

Пахаванне побач з касцёлам — так шануюць памяць выбітных ксяндзоў. Развітацца з ім прыйшлі тысячы вернікаў. На пахаванне прыехалі біскупы з Беларусі, Літвы, Польшчы.

Булька стаў святаром у 60 гадоў. У мосарскай парафіі Віцебскай дыяцэзіі ксёндз адслужыў больш за дваццаць гадоў. Дзякуючы яго намаганням, былі адноўленыя і пабудаваныя 8 касцёлаў, святарамі сталі 17 ягоных вучняў.

Ён быў неардынарны чалавек. Ведамасць святару прынесла паслядоўная барацьба з алкагалізмам. Пры касцёле была закладзена алея цвярозасці, створаны антыалкагольны музей, а на тэрыторыі сельсавета намаганнямі ксяндза не прадаюць спіртныя напоі. Не ўсім падабаліся метады тае барацьбы — кс.Юозас мог адмовіцца адпяваць нябожчыка, калі на памінальны стол ставілася гарэлка, мог прыйсці на вяселле з антыалкагольнай прамовай. Але


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

шмат хто і сапраўды кінуў піць.

Дзякуючы ахвярнай працы немаладога чалавека, прыкасцёльная тэрыторыя ператварылася ў дэндрапарк. Мосар стаў турыстычным цэнтрам. Дзейнасць святара адзначылі ўлады: у 2005 годзе Юозас Булька стаў першым ксяндзом, удастоеным лукашэнкаўскай прэміі «За духоўнае адраджэнне», а ў 2006 годзе быў узнагароджаны медалём Скарыны.

У той жа час апошнія гады ягонага жыцця былі азмрочаны прывідамі з мінулага.

Літоўская пракуратура абвінаваціла яго ў саўдзеле ў генацыдзе літоўцаў пры саветах на пачатку 1950-х. Яму закідалі забойствы дзясяткаў партызан.

Ксёндз з'явіцца ў Літву на суд адмовіўся. «Людзі судзяць адзін аднаго і хай судзяць, але Бог усё паставіць на свае месцы», — сказаў святар у інтэрв'ю «НН» у студзені 2009 года.

**Сяргей Гезгала**

# Дырэктар, які не пакаяўся

**Былога дырэктара МТЗ пратрымалі за кратамі 8 гадоў. Бо ён так і не папрасіў у Лукашэнкі памілавання.**

8 студзеня на волю з мінскай турмы выйшаў былы дырэктар Мінскага трактарнага завода Міхаіл Лявонаў. За кратамі ён правёў восем гадоў.

Гэта ўнікальны выпадак, калі прадстаўнік дырэктарскага корпуса правёў за кратамі так доўга. Лявонаў так і не папрасіў у Лукашэнкі памілавання, як рабілі ягоныя калегі.

Лявонава арыштавалі ў пачатку 2002 года, калі ён кіраваўся ў Маскву. У віну дырэктару паставілі злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, крадзеж у буйных памерах, адмыванне грошай, нелегальнае адкрыццё валютных рахункаў, ухіленне ад падаткаў, хабарніцтва.

Пры такім букеце крымінальных артыкулаў Вярхоўны суд вынес прысуд — 10 гадоў калоніі. Восем з іх Лявонаву давялося правесці непасрэдна ў турме. На зоне Лявонаў зноў займаўся трактарамі – быў брыгадзірам участка, дзе шыюцца чахлы для сядзенняў «Беларусаў».

Цяпер Лявонаў таксама вызвалены не цалкам. Цягам двух бліжэйшых гадоў ён будзе знаходзіцца пад наглядам міліцыі Фрунзенскага раёна. Працэдура называецца «прэвентыўны нагляд», тая ж «хатняя хімія».

«Я зараз проста хачу пабыць з сям'ёй, — кажа былы вязень. — Я лічыў і лічу, што ў сто разоў чысцейшы за тых, хто мяне саджаў. І лічу, што жыў і буду жыць правільна», — кажа экс-дырэктар.

За кратамі ў Беларусі знаходзіцца дзясяткі іншых дырэктараў і кіраўнікоў заводаў і прадпрыемстваў розных узроўняў.

**ЗП**


PHOTO.BYMEDIA.NET

## СЦІСЛА

### У Віцебску схаладае да мінус 25°C

13—15 студзеня краіну накрые новая хваля маразоў. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 9—16°С, пры праясненнях да мінус 20—22°С, днём мінус 6—13°С. Найхаладней будзе пад Віцебскам. Розніца тэмператур між паўночным усходам і Брэстам складзе каля 10 градусаў.

### Мэта ўрада: ВУП +13%

Урад зацвердзіў эканамічны прагноз на 2010 год. Ён эйфарычны: валавому ўнутранаму прадукту загадана вырасці на 11—13%. Пры гэтым зніжэнне энергаёмістасці прагназуецца на 8—10%. А значны дэфіцыт бягучага рахунку плануецца кампенсаваць замежнымі крэдытамі.

### Суткі прыборкі каштуюць 2 млрд

У сталіцы снег прыбірае штодзённа аж 780 адзінак тэхнікі. На гэта кожны дзень затрачваецца 2 млрд рублёў.

### Лукашэнка зноў паедзе ў Вільню?

Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ разглядае магчымасць запрашэння на святкаванне 20-х угодкаў аднаўлення незалежнасці краіны прэзідэнтаў суседніх дзяржаваў, у тым ліку Беларусі.

### «Рок-Каранацыя» пройдзе ў «Рэактары»

Цырымонія ўзнагароджання найлепшых музыкаў адбудзецца 4 сакавіка. Сваю згоду на ўдзел далі «Крама», «Нейра дзюбель», Вайцюшкевіч. Завяршаюцца перамовы з асноўнымі прэтэндэнтамі на рок-карону — гуртамі «Ляпіс Трубяцкой» і The Toobes.

**СМ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| Агулам | | | | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

КВІТАНЦЫЯ

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| Агулам | | | | |

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй падпісчыкам

Тацяне Р. з Бярозаўскага раёна.
Міхаілу Т. са Слуцкага раёна.
Барысу Л. з Пастаўскага раёна.
Ігару Л. са Стаўбцоўскага раёна.
Аляксандру А. з Нясвіжскага раёна.
А.П. са Жлобінскага раёна.
Яўгенію К. са Шклоўскага раёна.
Сяргею П., Віктару А. з Гомеля.
Н.Х. са Шчучынскага раёна.
Паўлу Л., Андрэю К. з Глыбоцкага раёна.
Т.К., М.Я., А.Т. са Смалявіцкага раёна.
Генадзю К., А.А., Лявону Л., Антаніне К., Зоі Д. з Мінскага раёна.
Віктару Н. з Ліды.
Пятру М., Уладзіміру Л. з Маладзечанскага раёна.
Ірыне Г. з Бялыніцкага раёна.
Сяргей Ц. з Лепельскага раёна.
Галіне Ч. з Рэчыцкага раёна.

# Януковіч, Цімашэнка і ўсе-ўсе-ўсе

17 студзеня ва Украіне адбудуцца выбары прэзідэнта. Як звычайна, першым турам кампанія не абмяжуецца. Ніводны з кандыдатаў не мае падтрымкі абсалютнай большасці насельніцтва.

У лідэрах «вялікая двойка»: Віктар Януковіч і Юлія Цімашэнка. Цяперашні прэзідэнт Віктар Юшчанка сярод іх стаў трэцім лішнім.

### Знаёмыя твары

Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала 18 кандыдатаў. Тут сітуацыя стабільная — на папярэдніх выбарах было 20 прэтэндэнтаў.

Кожны кандыдат мусіў унесці заклад памерам 300 тысяч даляраў, гэтым адсейваліся «гарадскія вар'яты». Хоць жарцікаў хапае — напрыклад, у спісе прадстаўлены Васіль Працівсіх. Па гучанні ягонае прозвішча супадае з украінскай фразай «супраць усіх». Раней ён быў Гуменюком.

Лідэр Партыі рэгіёнаў Віктар Януковіч утрымлівае ўпэўненае першае месца па выніках усіх апытанняў. Адно «але» — ён мае шмат рашучых праціўнікаў, і новых выбарцаў у Януковіча можа не з'явіцца.

### Былая аранжавая грамада

Ідэалы дэмакратычнай Украіны хоча ўвасабляць Юлія Цімашэнка. Усю перадвыбарную кампанію яна прасядзела на другім месцы, і цяпер гатовая да скачка на вяршыню. Надзіва, падлашчванні да Крамля не адштурхнулі ад яе Заходнюю Украіну. Цімашэнка ўмее ўдала выкарыстоўваць папулізм. Жанчыны ёй вераць, праўда, мужчыны — не заўсёды.

Шматмільённая армія падтрымкі Віктара Юшчанкі разбеглася па канкурэнтах. Тым не менш, актыўная кампанія можа дазволіць дзейснаму прэзідэнту пазмагацца.

Украінцы, стомленыя ад Юшчанкі, Цімашэнкі і Януковіча, былі гатовыя паверыць ў новых людзей у палітыцы.

### «Краіну выратуе Арсень»

Малады палітык, 35-гадовы Арсень Яцанюк, імкліва ўварваўся ў вялікую палітыку. Ён паспеў пабыць міністрам эканомікі, міністрам замежных спраў і спікерам Вярхоўнай Рады і лічыўся самым перспектыўным палітыкам Украіны. Яцанюк выступіў на электаральным полі Юшчанкі і пачаў імкліва набіраць рэйтынг, аднімаючы працэнты яшчэ і ў Цімашэнкі. Год таму ягоны рэйтынг перавысіў 15%. Толькі праз некалькі месяцаў, калі рэйтынг пачаў падаць, высветлілася, што кандыдат пачаў агітацыю зарана. Імідж Яцанюка-супермэна, які выратуе краіну, быў успрыняты насельніцтвам з усмешкай.

Затое пэўную частку выбарцаў прыцягнулі радыкальна нацыяналістычныя лозунгі Алега Цягнібока.

### Мільярдэр у свабодным плаванні

Яшчэ адзін альтэрнатыўны кандыдат, Сяргей Цігіпка, таксама быў міністрам эканомікі, яшчэ за часамі Леаніда Кучмы. Пяць гадоў таму Цігіпка ўзначальваў выбарчы штаб Януковіча, але пасля паразы шэфа адправіўся ў свабоднае плаванне.

Мільярдэр Цігіпка — ягоны бізнэс ацэньваецца ў $1,3 мільярда — меў магчымасці, каб правесці гучную агітацыйную кампанію. Калі Яцанюк падбірае галасы тых, хто расчараваўся ў Юшчанку, то Цігіпка працуе з электаратам Януковіча.

Як і з іншымі багатымі кандыдатамі, з ім працуе надзвычай дарагі рэкламіст — француз Сегела.

### Старая гвардыя

Уладзімір Літвін, Аляксандр Мароз і Пётр Сіманенка — пастаянныя ўдзельнікі палітычных кампаній. У іх ёсць устойлівы электарат, які складае трохі менш за 5%, і магчымасць гандлявацца гэтымі працэнтамі з лідэрамі прэзідэнцкай гонкі. На сур'ёзныя пасады яны не прэтэндуюць, але сваё месца на палітычным полі маюць.

Палітычны курс Украіны вызначаецца стабільнасцю, таму для Беларусі няма вялікай розніцы, хто пераможа на гэтых выбарах. Фатальнай была б толькі перамога такога палітыка, які дарэчы б Украіну да вайны з Расіяй за Крым. Або да эканамічнага банкруцтва і страты кантролю над газаправодамі. Беларусь і Украіна здольныя ўзгоднена дыктаваць умовы расійскім газавым і нафтавым кампаніям.

Цікава, што і Януковіч, і Цімашэнка дэкларуюць намер замяніць расійскі газ украінскім вугалем.

**Ягор Марціновіч**







# Андрэй Клімаў: Хутчэй жывы, чым мёртвы

21 сакавіка адбудзецца справаздачна-выбарчы з'езд Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Цяперашняму старшыні арганізацыі Анатолю Лябедзьку давядзецца пазмагацца, каб застацца на пасадзе. Сярод імаверных супернікаў Лябедзькі найчасцей называецца былы палітвязень Андрэй Клімаў. Цяпер Клімаў блізкі да Руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча.

**«Наша Ніва»: Ходзіць шмат размоваў пра Вашае магчымае вылучэнне на пасаду старшыні АГП. Гэта праўда?**

**Андрэй Клімаў:** Думаю, што гэта сведчыць пра тое, што я хутчэй жывы, чым мёртвы. Калі гаварыць сур'ёзна, то мне не да актыўнай палітычнай барацьбы цяпер. Я далёкі ад таго, якую палітыку цяпер праводзіць мая партыя. Раней, прынамсі, там усё было ў парадку.

**«НН»: А чаму адышлі ад палітыкі?**

**АК:** Па-першае, я ўсё яшчэ не адышоў ад тых стрэсаў, якія са мной здарыліся. Маю за ўвазе тры судзімасці, тры турэмныя тэрміны. Па-другое, мне няясныя пакуль палітычныя перспектывы. Пакуль у краіне не вырашаныя эканамічныя праблемы, то гаварыць пра палітыку не даводзіцца. Гаворка ўвогуле вядзецца пра захаванне суверэнітэту Беларусі. Цывілізаваная палітычная сістэма можа быць выбудаваная толькі пасля вырашэння ўсіх гаспадарчых пытанняў. Пакуль жа палітыка ў нас праходзіць на мяжы фолу, часта з небяспекай для жыцця. Я ў такім удзельнічаць не хачу.

**«НН»: Апазіцыя павінна ўдзельнічаць у наступных прэзідэнцкіх выбарах?**

**АК:** Калі яны згодныя на ролі акцёраў, якія падыгрываюць уладзе за грошы ці бясплатна, то калі ласка. Але асабіста я сэнсу ў гэтым не бачу.

**«НН»: А чым увогуле займаецеся?**

**АК:** Працы шмат. Найперш мне яшчэ трэба вырашыць праблемы са здароўем, па-ранейшаму праходжу паслятурэмны курс рэабілітацыі. Цяпер займаюся тым, каб з мяне знялі хаця б першую судзімасць. Сямейныя справы, у мяне трое дзяцей, і я хачу праводзіць з імі больш часу, чым раней. Плюс да ўсяго трэба заставацца на плыву, зарабляць грошы. Дапамагаю некаторым сябрам па бізнэсе. Яшчэ кнігі пішу.


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

Мілінкевіч даў мне другое дыханне.

**«НН»: Можа, што хутка выйдзе?**

**АК:** Папраўдзе, у мяне ўжо ёсць гатовыя рэчы. Але я не бачу падыходзячага моманту, каб выдаць іх.

**«НН»: З некім з палітыкаў супрацоўнічаеце?**

**АК:** У мяне чэснае і шчырае супрацоўніцтва з Аляксандрам Мілінкевічам. Гэты чалавек даў мне другое дыханне. Я яму за гэта вельмі ўдзячны. Я цалкам падтрымліваю тую палітыку, якую праводзіць Мілінкевіч, на збліжэнне Беларусі з Еўрасаюзам. З іншымі неяк не атрымліваецца.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Андрэй Клімаў**

нарадзіўся 17 верасня 1965 у Мінску. Служыў у органах унутраных спраў СССР. З пачаткам беларускай незалежнасці стаў адным з найбольш паспяховых бізнэсменаў, быў дырэктарам ААТ «Андрэй Клімаў і К°» (1991—1996). Валодаў будаўнічай фірмай, банкам і газетай, быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета 13 склікання. У 1996 быў адным з рухавікоў імпічменту Лукашэнкі. У 1998 быў арыштаваны, абвінавачаны ў прадпрымальніцкай дзейнасці без ліцэнзіі. Адсядзеў 4 гады. Потым яшчэ двойчы сядзеў. Сябар АГП.

## Дзевяць мільёнаў штрафу навагрworld навагрудскаму антыкамуністу

11 студзеня суддзя Навагрудскага раённага суда Валеры Цынкевіч вынес вырак па крымінальнай справе актывіста Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Юрася Казака, які абліў фарбай бюст Леніна. Суд пакараў хлопца 250 базавымі велічынямі штрафу (8 750 000 рублёў).

Такім чынам, суддзя цалкам задаволіў патрабаванне дзяржаўнага абвінаваўцы. Індывідуальны прадпрымальнік Юрась Казак мусіць сплаціць гэты штраф цягам месяца, інакш можа апынуцца ў турме.

7 лістапада Юрась Казак абліў фарбай помнік Леніну на цэнтральнай плошчы Навагрудка. Хлопец прызнаўся, што сапраўды гэта зрабіў. Аднак, як зазначыў ён на судзе, ягонай мэтай было не знішчэнне бюста, а прыцягненне ўвагі да праблемы камуністычнай спадчыны ў Беларусі.

На мінулым тыдні ў 25-гадовага Юрыя нарадзілася дачка Рагнеда, жонку яшчэ нават не выпісалі з бальніцы.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Мінюст забараніў ТБМ абмяркоўваць Інтэрнэт

Таварыства беларускай мовы атрымала запыт ад Міністэрства юстыцыі праз тое, што мела правесці круглы стол на тэму «Беларускі інтэрнэт, дзяржаўныя абмежаванні і рэгуляванні». Мінюст заўважыў, што абмеркаванне ўказаў не адпавядае статуту арганізацыі.

### Новы прэзідэнт Харватыі

Прэзідэнтам Харватыі стаў сацыял-дэмакрат Іва Ёсіпавіч. Ён набраў больш за 60% галасоў. Перад Ёсіпавічам будзе стаяць задача ўступлення Харватыі ў Еўрасаюз. Цікава, што прэзідэнтам стаў кампазітар, які пасля аднаўлення краінай незалежнасці надоўга адышоў ад палітыкі.

**ЗП**

# Зводкі з усходняга фронта

**Расіі выгадна зацягваць перамовы з Беларуссю па цане на нафту.**

Беларуска-расійская вайна за нафту працягваецца безвынікова ўжо другі тыдзень. Яна пачалася з першых дзён студзеня, калі стала зразумела, што тэрмін дзеяння ранейшай дамовы аб пастаўках нафты скончыўся, а новую падпісаць не ўдалося. З таго часу два віцэ-прэм'еры — беларус Уладзімір Сямашка і расіянін Ігар Сечын — спрабуюць дамовіцца ледзь не штодзень.

Паводле інфармацыі «Коммерсанта», на мінулым тыдні дэлегацыі наблізіліся да кампрамісу, але ў апошні момант падпісанне дамовы было сарванае.

### Мір? Вайна!

Якая ж пазіцыя, здаецца, задаволіла абодва бакі?

Унутраныя патрэбы Беларусі складаюць, як лічыцца, 8 мільёнаў тон нафты ў год. Паколькі ў самой краіне здабываецца 1,7 млн т, Расія прапанавала неабходныя для ўнутранага спажывання 6,3 млн т прадаць бязмытна, а ўвесь астатні аб'ём — па рынкавых цэнах.

Беларусь паспрабавала ўнесці маленькае ўдакладненне, якое тычылася тых самых 1,7 млн т, што здабываецца ў Беларусі. Наша краіна хацела палову гэтага аб'ёма прадаваць за мяжу, патрабуючы ад Расіі яшчэ 850 тысяч бязмытных тон.

Такім чынам, цана пытання звялася да $80 млн — дробязі, калі ўлічыць, што за год Беларусі прыйдзецца заплаціць на $2 млрд больш, чым раней. Тым не менш, перамовы былі сарваныя. Віну за зрыў перамоваў абедзьве дэлегацыі ўсклалі на іншы бок.

### Чым пагражаем?

Пакуль нафта паступае ў Беларусь бесперапынна. Так што ў краінаў ёсць час дамовіцца — радыкальныя крокі ніхто не наважваецца рабіць. Хоць аргументы для шантажу ёсць у кожнага з бакоў.

У Масквы аргумент адзін, затое жалезны. Паколькі менавіта Расія гатовая дараваць Мінску каля $1,8 млрд, пастаўляючы частку нафты бязмытна. «Не падабаюцца такія зніжкі — не будзе ніякіх», — перадаў праз прэсу ультыматум расійскага боку «адзін з вядучых расійскіх экспертаў у нафтавай сферы». І параіў не зацягваць працэс.

Але некалькі крокаў у адказ назапашана і ў Беларусі. Урад гатовы павялічыць мыта на транзіт расійскай нафты ў 11 разоў: ад $3,9 да $45 за тону. Летась па беларускіх трубах прапампавалі 80 млн т, сёлета пойдзе менш, але як мінімум $2,5 млрд на гэтым Беларусь выйграе.

Варта згадаць, адкуль увогуле ўзялося «мыта на транзіт нафты» — Лукашэнка прыдумаў яго ў 2007 г., у час мінулай энергетычнай вайны, каб кампенсаваць падаражэнне газу. Лічба ў $3,9 за тону была ўзятая са столі — проста каб «адбіць» грошы. Цяпер спрацоўвае тая ж логіка — Расія папросіць $2 млрд мыта, а пасля заплаціць $2,5 млрд за транзіт. І Беларусь зноў у плюсе.

У параўнанні з гэтай камбінацыяй пагроза адключыць электраэнергію Калінінградскай вобласці выглядае дробным шкодніцтвам.

Лішне казаць, што ў адказ на заявы расійскіх нафтавых экспертаў падвысілі голас і беларускія афіцыйныя СМІ. Некаторыя, каментуючы перамоўны працэс, адзначалі з намёкам, што Мытны саюз праіснаваў усяго тры дні.

### Дадатковы бонус

Нафтавая вайна з Расіяй, якім бы ні быў яе вынік, надзвычай карысная для эканомікі нашай усходняй суседкі. За час канфлікту сусветныя цэны на нафту пайшлі ўверх. Яны ўжо пераадолелі адзнаку ў $83 за барэль. Калі сам працэс перамоваў дае такі эфект, чаму б не працягваць яго яшчэ і яшчэ?

**Ягор Марціновіч**

# Паводле «індэкса бігмака»

**Кошт беларускага рубля значна недаацэнены.**

На гэта ўказвае «індэкс бігмака», які штогод разлічваецца часопісам The Economist. У Беларусі бігмак прадаюць за 2,26 даляра (6 400 руб.), а ў ЗША — за 3,58 даляра.

Ідэя Big Mac Index заснавана на тэорыі парытэту пакупніцкай здольнасці, згодна якой сапраўдная вага валюты разлічваецца паводле таго, колькі пэўных тавараў можна набыць за гэту адзінку валюты ў краіне.

Пры разліках Big Mac Index за аснову бярэцца кошт двайнога гамбургера, які прадаецца ў сетцы рэстаранаў McDonald's па ўсім свеце.

У Беларусі бігмак прадаюць за 2,26 даляра (6 400 руб.), а ў ЗША за 3,58 даляра. З улікам курсу беларускага рубля атрымліваецца, што курс даляра павінен складаць у Беларусі 1787 рублёў (—30%).

У суседняй Расіі бігмак каштуе прыкладна столькі ж — 2,34 даляра. Такім чынам, курс расійскага рубля павінен складаць меней 20 рублёў за даляр. Самыя танныя бігмакі прадаюць у Кітаі — 1,83 даляра, таму менавіта кітайскі юань лічыцца сама недаацэненай валютай, якая да справядлівага курса не дацягвае амаль 50 %. Самай пераацэненай валютай у адносінах да даляра ЗША аказалася нарвежская крона, якая каштуе на 96 % даражэй.

**Вольга Жарнасек**

# Расійскія святы каштавалі 23 мільярды даляраў

**У Расіі на Новы год чыноўнікі і большасць прадпрыемстваў 11 дзён не працуюць.**

У выніку такога доўгага прастою вытворчасці расійскі бюджэт недаатрымае агучаную суму.

Ва ўсходніх суседзяў Новы год спалучаецца з выхаднымі і святкаваннем Раства. У выніку ў Расіі першы працоўны тыдзень пачаўся толькі 11 студзеня.

Прыбыткі атрымалі толькі вытворцы гарэлкі і турфірмы. За святы грамадзяне Расіі выпілі чвэрць мільярда пляшак гарэлкі, а гатэлі за 11 дзён атрымалі чвэрць гадавога прыбытку.

**АП**

# Бяруць максімум

**Дзяржаўныя ўласнікі паднялі цану арэнды памяшканняў удвая.**

Арандатары могуць адказаць ростам цэнаў на тавары і паслугі.

З 1 студзеня ўступіў у сілу ўказ «Аб некаторых пытаннях арэнды і бязвыплатнага карыстання маёмасцю». Ён скасаваў прывязку цаны арэнды офісных і складскіх памяшканняў да еўра, які працягваў расці і павялічваць цану арэнды. Ва ўказе зацікаўленым бакам — уласніку памяшкання і арандатару — было прапанавана вырашыць пытанне самастойна, карыстаючыся пры разліку арэнднай платы каэфіцыентамі ад 0,5 аж да 3. Такая вялікая разбежка дазваляе дакладна разлічыць цану, улічыўшы попыт, тэхнічны стан памяшкання і камерцыйную выгаду.

Аднак на справе ўласнікі дзяржаўных памяшканняў адразу выставілі максімальны каэфіцыент — 3, якія б іх памяшканні ні былі. Прадпрымальнікі схапіліся за галаву — арэнда можа падаражэць удвая. Каб не прагараць, яны змушаныя будуць падвышаць цэны на сваю прадукцыю і паслугі.

На тое, каб прывесці дамовы арэнды ў адпаведнасць з новымі ўмовамі, ёсць тры месяцы. Бізнэсоўцы збіраюцца звярнуцца да ўлады з просьбай прыняць яшчэ адзін дакумент, які будзе рэгуляваць дзейнасць чыноўнікаў, што займаюцца выстаўленнем каэфіцыентаў арэнды.

**ЯМ**

# Балівар не вытрымаў

**У Венесуэле цяпер тры курсы даляра. Вучыся, Беларусь?**

Беларускі досвед навагодняй дэвальвацыі пераняў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавэс. 8 студзеня ён аб'явіў аб змене курса нацыянальнай валюты — балівара — да даляра. Ранейшы курс складаў 2,15 балівара за $1. Цяпер афіцыйна ўтвораныя два курсы — адзін для стратэгічнага імпарту абсталявання і харчавання дзяржаўнымі прадпрыемствамі (2,6 балівара за $1), другі — для астатняга імпарту (4,3 балівара за $1).

Дэвальвацыя мусіць дапамагчы эканоміцы краіны выйсці з крызісу. У той жа час рэальны курс нацыянальнай валюты на чорным рынку па-ранейшаму перавышае 6 балівараў за даляр. Праз нізкія цэны на нафту ВУП Венесуэлы скараціўся на 2,4%, а інфляцыя склала 25%.

Жыхары Венесуэлы адгукнуліся на дэвальвацыю, як і беларусы год таму — чэргамі ў крамах і скупам усіх патрэбных і непатрэбных тавараў. Некаторыя крамы гарачыя паўднёваамерыканцы ўзялі штурмам. Чавэс адрэагаваў на падзеі заявай, што жаўнеры Нацыянальнай гвардыі павінны «выйсці на вуліцы» і разам з народам пачаць барацьбу са спекуляцыяй.

Яшчэ да дэвальвацыі балівара беларускі незалежны эканаміст Сяргей Чалы выказаў меркаванне, што некалькі курсаў даляра могуць узнікнуць у нашай краіне. Хоць гэта і супярэчыць вымогам Міжнароднага валютнага фонда. «Мы тым самым зможам забіць некалькі зайцаў — па афіцыйным курсе мы атрымаем патрэбны рост заробкаў», — тлумачыць эканаміст.

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Гуляй, Ліда!

Сёлета «Дажынкі» пройдуць у Лідзе і Лідскім раёне. Папярэдне плануецца, што фестываль-кірмаш адбудзецца ў другой палове верасня. У 2008 годзе Оршы на «Дажынкі» перапала $145 мільёнаў, а ў 2009-м, пасля дэвальвацыі рубля, Кобрыну выдаткавалі $120 млн.

### Кірмаш фанабэрыі

У Аб'яднаных Арабскіх Эміратах адкрыўся самы высокі ў свеце хмарачос. Будынак «Бурдж Халіфа» ў Дубаі мае ўвышкі 818 метраў. Будавалі яго шэсць гадоў. Агулам працы каштавалі больш за $4 млрд. Як заяўляюць праектавальнікі, будынак ўстойлівы да моцных вятроў, можа вытрымаць землятрус.

Дубайскі хмарачос больш чым на 300 метраў абагнаў будынак у сталіцы Тайваня Тайпэі, які раней лічыўся самым высокім у свеце. Але рэкорд не пратрымаецца доўга. Прынц з Саўдаўскай Аравіі сабраўся будаваць вежу Kingdom Tower вышынёй 1,1 км.



### Курыная вайна Расіі і ЗША

У Расію забаронены ўвоз амерыканскага курынага мяса. У «ножках Буша», мяркуюць, зашмат хлору, таму яны не адпавядаюць новым расійскім санітарным нормам, уведзеным 1 студзеня. Летась на долю амерыканскага мяса прыйшлося каля 22% расійскага рынку і 79% імпарту мяса птушкі.

**ЯМ**

# Свабода Сяргея Каваленкі

**35-гадовы будаўнік з Віцебска стаў нацыянальным героем.**

Бачыць бел-чырвона-белыя сцягі ў Віцебску і ваколіцах можна нярэдка. Менавіта тут некалі разгарнуў сваю дзейнасць легендарны Мірон. І многія працягваюць ягоную справу.

Сцягі ў Віцебску луналі на высокіх комінах, лініях электраперадач, у іншых цяжкадаступных месцах. Аднак гэтая акцыя была самай дзёрзкай. 7 студзеня 2010 года вялізнае бел-чырвона-белае палотнішча з'явілася на навагоднай яліне, што стаіць на плошчы Перамогі абласнога цэнтра. Прычым з'явіўся сцяг сярод дня, у 12.30. Каб зняць яго з 35-метровай вышыні, давялося выклікаць пажарную машыну з раскладной лесвіцай.

Так павіншаваў землякоў з праваслаўным Раством 35-гадовы будаўнік Сяргей Каваленка. Праз колькі хвілін міліцыя яго ўзяла.

### Спецыяліст па сцягах

Сяргей Каваленка не першы раз трапляецца са сцягамі. Вывешванне бел-чырвона-белага штандара Каваленка лічыць самым эфектыўным спосабам нацыянальнага самавыражэння. Толькі летась яго затрымлівалі пяць разоў, але то ўсё былі адміністрацыйныя справы, якія сканчаліся штрафамі. «Калі забараняюць рабіць нешта, мне падабаецца рабіць насуперак — супраць прыгнечанасці нашага народа, супраць забітасці... Я не згодны з тым, што ў краіне ўціск, што людзі баянтэжацца размаўляць на роднай мове. А я хачу, каб людзі былі больш адкрытыя, больш шчырыя і не баяліся нікога!» — казаў С.Каваленка пасля аднаго з судовых працэсаў.

### Будаўнік

Сяргею Каваленку 16 студзеня споўніцца 35 гадоў. Ён мае сярэднюю спецыяльную адукацыю. Скончыў Віцебскі політэхнічны тэхнікум, па спецыяльнасці — радыёэлектрык. Трохі парабіў інжынерам на дзяржаўным прадпрыемстве. Пасля ездзіў на заробкі — будаваць Маскву. Да апошняга часу Сяргей жыў разам з маці, жонкай, сынам і малодшым братам. Бацька сышоў з сям'і, калі Сяргею было 20 гадоў. Нядаўна маладая сям'я атрымала ўласную кватэру, але пераехаць туды яшчэ не паспела.

У Кансерватыўна-хрысціянскую партыю БНФ Сяргей Каваленка трапіў у 2007 г. — праз легенду віцебскага апазіцыйнага руху Барыса Хамайду. Спадар Хамайда і ў снег, і ў спёку выходзіць на цэнтральную плошчу Віцебска, да «Сіняга дома» (будынка аблвыканкама), распаўсюджваць незалежную прэсу. «Яшчэ ў 2005 годзе ён пачаў падыходзіць да мяне, пра жыццё размаўляць, — згадвае Хамайда пра Сяргея Каваленку. — Я адчуваў, што ў яго ёсць нейкі ўнутраны стрыжань. І вось у апошнія некалькі месяцаў я зразумеў, наколькі гэта надзейны хлопец, які плячо падставіць, не здрадзіць. Моцны хлопец — такі, якім і павінен быць сапраўдны беларус».

Дастаткова пабачыць Сяргея, каб пагадзіцца з характарыстыкай Хамайды. Цвёрды твар, нібы з класічных палотнаў. Такія раней адбівалі на манетах. Сведчанне цэльнага характару.

### Шпілька Косінцу

У 2008 годзе за святкаванне Дня Волі Сяргей Каваленка атрымаў свае першыя 10 сутак. Падчас «Чарнобыльскага шляху» таго года ён зноў трапіў у ізалятар. Апошняя адміністратыўная справа супраць яго скончылася 15 верасня 2009 штрафам у 1 млн 50 тыс. рублёў за вывешаны сцяг. Штрафы яго не палохалі.

Але гэтым разам выпадак быў асаблівы. 35-метровая яліна, найвышэйшая ў Беларусі, была пастаўленая на плошчы Перамогі ў Віцебску з асабістай ініцыятывы кіраўніка аблвыканкама Аляксандра Косінца. Ён жа распарадзіўся ладзіць там навагоднія святкаванні. Гэтая плошча — прадмет гонару амбітнага кіраўніка Віцебшчыны, год таму пераведзенага на гэтую пасаду з віцэ-прэм'ераў.

### Артыкул 339 частка 2

Актывіста даставілі ў ізалятар часовага ўтрымання і пастанавілі затрымаць да 11 студзеня. Ад 8 да 10 студзеня, нягледзячы на святы, ад ранку да вечара Каваленку дапытвалі. Мужчына не стаў адмоўвацца і прызнаў, што сцяг сапраўды ўзняў ён.

Супраць апазіцыянера распачалі крымінальную справу па артыкуле 339 частка 2 (хуліганства, здзейсненае паўторна, або групай асоб, альбо звязанае з супрацівам асобе, якая спыняла хуліганскія дзеянні, альбо спалучанае з прычыненнем менш цяжкага цялеснага пашкоджання). Гэты артыкул прадугледжвае зняволенне да 6 гадоў.

У нядзелю пракурор вырашыў змясціць Каваленку на два месяцы, пакуль будзе весціся следства, у віцебскі СІЗА. Актывіст адразу запатрабаваў, каб матэрыялы справы вяліся па-беларуску.

9 студзеня, калі Каваленка яшчэ быў у ІЧУ, міліцыя затрымала яшчэ аднаго віцебскага актывіста — Тараса Сургана, з якім Каваленка неаднойчы разам вешаў сцягі. Сургана схапілі, калі ён выносіў смецце, завезлі ў міліцыю, інкрымінавалі «лаянку матам». Да раніцы 11 студзеня спадар Тарас знаходзіўся ў ізалятары. Ён звязвае сваё затрыманне са справай Каваленкі: «Гэта пачатак правакацый у адносінах да віцебскіх актывістаў. Улада проста спалохалася».



СЯРГЕЙ СЕРАБРО

**На Раство Сяргей Каваленка вывесіў сцяг на самай высокай навагодняй яліне Беларусі.**

### «Прыстойны чалавек, што сказаць больш»

Маці Сяргея Каваленкі Лідзія Уладзіміраўна працуе ў сістэме ЖКГ. Яна засмучаная арыштам сына. У размове не хавае слёз. «Прыстойны і чэсны чалавек, я не ведаю, што сказаць больш. Я бачыла сына ў міліцыі крышку. У яго твар быў вельмі змрочны, чорны як зямля», – кажа маці.

### Калі нешта вырашыў, абавязкова зробіць

Малодшы брат Віталь падтрымлівае Сяргея. Між братамі сем гадоў розніцы, але яны заўсёды добра разумелі адзін аднаго. «Сяргей — чалавек рашучы, калі нешта вырашыць, абавязкова зробіць. Ён гісторыю любіць, па-беларуску размаўляе. У яго цвёрдыя перакананні. Мне заўсёды парады карысныя дае як старэйшы брат. Мяне радуе, што яго цяпер так моцна падтрымліваюць паплечнікі», – кажа Віталь Каваленка.

### Каваленка аб'яднаў апазіцыю

У першыя ж дні пасля арышту Сяргея Каваленкі насупраць будынка Кастрычніцкага РУУС Віцебска з'явілася расцяжка «Свабоду Каваленку». Той арышт аб'яднаў віцебскую апазіцыю. Мясцовыя актывісты, незалежна ад партыйнай прыналежнасці, стварылі аргкамітэт у абарону палітвязня. 16 студзеня яны заклікаюць усіх неабыякавых падысці да СІЗА ў 11.00, каб павіншаваць Каваленку з днём нараджэння. На першым пасяджэнні было сабрана 300 тысяч рублёў падтрымкі палітвязню.

У інтэрнэце Каваленка за лічаныя дні стаў сапраўдным нацыянальным героем. Ягоны як высечаны з мармуру твар можна бачыць у дзясятках блогаў і сайтаў.

Робіцца і хады ў адказ: 12 студзеня за збор сродкаў для Каваленкі на плошчы Перамогі ў Віцебску быў затрыманы Барыс Хамайда. Калі вярстаўся нумар, ён яшчэ знаходзіўся ў міліцыі.

Ля яліны ж цяпер стаіць варта.

Самога ж Каваленку 12 студзеня а 18 гадзіне з СІЗА нечакана вызвалілі. Відаць, у турме ён быў яшчэ больш небяспечным.

**Зміцер Панкавец**

**Шушкевіч: У тэхнічным і палітычным сэнсах гэта была цудоўная акцыя**

Лукашэнка дзейнічае метадамі захавання манархіі. Наша пракуратура можа адшукаць любы артыкул для Сяргея Каваленкі. Бясспрэчна, Каваленка — новы палітычны зняволены, патрыёт, якога пасадзілі за тое, што ён беларус. Але я вельмі ганаруся, што ў нас ёсць такія людзі як ён. Як фізік і як палітык магу сказаць, што ў тэхнічным і палітычным сэнсах гэта была цудоўная акцыя.

**«Салідарнасць»**

# Мірон. Легенда

**Першы свой сцяг наш беларускі Зорра ўзняў 27 ліпеня 1995 года над 40-метровым комінам райбыткамбіната ў Лёзне. Побач была прымацаваная запіска: «Вярніце народу гістарычную памяць». Гэта быў пачатак.**

«Мірон перайменаваў станцыю «Красное знамя». «Легендарны Мірон вывесіў над фестывальным Віцебскам два бел-чырвона-белыя сцягі». «Мірон вывесіў сцяг над Палямі». Мы прывыклі да падобных загалоўкаў у незалежнай прэсе. Бясстрашны герой уздымаў сцягі ў розных кутках Беларусі з нагоды нацыянальных святаў, не прызнаных лукашэнкаўскай уладай. Ён заўжды заставаўся інкогніта. Невядома нават, адзін ці некалькі чалавек, рызыкуючы жыццём, узлазілі на высакавольтныя лініі ды коміны ў дзясяткі метраў вышыні. Мірон стаў легендай.

А пачалося ўсё 27 ліпеня 1995 года, у Дзень Незалежнасці. На 40-метровым коміне райбыткамбіната ў Лёзне з'явіўся бел-чырвона-белы сцяг. Побач была прымацаваная цыдулка: «Вярніце народу гістарычную памяць». І подпіс — Мірон. Так ён выказаў пратэст супраць рэферэндуму, на якім бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня» былі зменены на абноўленыя савецкія сімвалы.

Пазней невядомы мужчына ў гутарцы з журналістамі, адвярнуўшыся спіной, расказа, што прымацаваў побач бляшанку з надпісам «выбуховае прыстасаванне» — каб сцяг даўжэй правісеў. Міліцыянты стралялі ў тую бляшанку з карабіна. У часе другой гутаркі невядомы хаваў свой твар пад маскай, абяцаючы адкрыцца, калі прыйдзе час. Час, калі ён вывесціць бел-чырвона-белы сцяг над Домам урада. Так да тытула «легендарны» дадалося параўнанне з Зорра. Мірон — несапраўднае імя, патлумачыў невядомы, мог быць і Янка, і Васіль. Але такое імя было ў ягоным радаводзе.

Імя Мірона, ці аднаго з Міронаў, адкрылася сёлета, пасля неверагоднай акцыі ў Віцебску 7 студзеня 2010 года. У той дзень нацыянальны сцяг быў узняты на высачэзнай яліне. Быў затрыманы 35-гадовы будаўнік Сяргей Каваленка.

Учынкі Мірона натхнілі многіх. «Малады фронт» пачаў ладзіць акцыі «Горад наш!», вывешваючы сцягі на дахах. Яны трываюць да сёння, і ладзяць іх уже не толькі маладафронтаўцы. Адна з самых эфектных — 29 кастрычніка 2009 года, калі на праспекце Незалежнасці ў Мінску дзясяткі нацыянальных сцягоў змясцілі «Еўрапейская Беларусь». Такім чынам людзі пратэстуюць супраць уціску нацыянальна-беларускага ў лукашэнкаўскай Беларусі.

Асоба Мірона натхняе не толькі на дзеянні, але і на творы.

> «Дрыжыце: і калхозны трон,
> і падхалімскія капэлы,
> калі вывешвае Мірон
> сцяг родны бел-чырвона-белы!»

Гэтае чатырохрадкоўе Рыгор Барадулін дадаў да карціны мастака Аляксея Марачкіна «Мірон». Аддаючы належнае легендарнаму Мірону, Марачкін не абмежаваўся адной карцінай — на ягоныя словы бард Зміцер Сідаровіч спявае:

> «Мірон, Мірон, Мірон — легенда, міраж.
> Хто ён, адкуль ён?
> Ведама толькі — свой малец.
> Наш».

**Сямён Печанко**

# «Зброю возяць вельмі многія»

Беларускія лётчыкі не маюць працы дома і пускаюцца ў рызыкоўныя аперацыі дзеля заробку. Былі і трагедыі: у 2005-м у авіякатастрофе ў Танзаніі загінула пяць беларусаў, у 2007-м беларускі экіпаж з 11 чалавек загінуў у Самалі, у 2008-м у Судане загінуў беларускі бортінжынер...

Свежы прыклад — бортінжынер Міхаіл Петухоў, затрыманы ў Тайландзе пры канцы мінулага года. Самалёт Іл-76, зарэгістраваны ў Грузіі, вёз амаль 40 тон зброі з КНДР, што забаронена рашэннем Рады бяспекі ААН.

Беларускі пілот, які пасля развалу СССР быў у ліку першых перавозчыкаў грузаў у гарачыя месцы свету, на ўмовах ананімнасці распавёў «НН», чым займаюцца лётчыкі, народжаныя лятаць у Савецкім Саюзе, апошнія дваццаць гадоў.

**«Наша Ніва»: Выпадак з Петуховым — гэта заканамернасць ці выпадковасць?**

— Заканамернасць. Далёка не першая і, пэўна, не апошняя. З развалам Саюза не пры справах засталося вельмі многа пілотаў — і ваенных, і грамадзянскіх. А калі чалавек застаецца не пры справах — ён пачынае шукаць сабе працу.

Зброю возяць калі не ўсе, дык вельмі многія. Тут важны момант удачы і сумленнасць арганізатараў рэйсаў. Петухоў мог і не ўяўляць, што перавозіць зброю. Усіх дэталяў рэйса ды загрузак ён мог і не ведаць. Справа лётчыка — праверыць законнасць груза, наколькі магчыма, і здзейсніць яго перавозку з пункта А ў пункт Б. Экіпажы становяцца закладнікамі сітуацыі несвядома ці памылкова. Пілоту даюць дакументы на пралёт, але яны могуць быць несапраўднымі. Папера ёсць — ён паляцеў.

**«НН»: Калі самалёт у Бангкоку быў затрыманы, з'явілася шмат тэорый наконт таго, хто быў арганізатарам рэйса. Брытанскія СМІ знайшлі след самалёта ажно ў Беларусі...**

— Арганізатарам рэйса мог аказацца хто заўгодна. Беларусь як краіна тут абсалютна не пры справах. На борце самалёта апынуліся і расіяне, і казахі, і беларусы. Гэта зборная салянка з людзей, якія не знайшлі сябе на радзіме і пачалі шукаць прыгодаў у іншых краінах.

**«НН»: Журналісты высветлілі, што самалёт належыць расійскаму прадпрымальніку Віктару Буту, які зараз сядзіць у тайландскай турме. Раней Бут неаднойчы наведваў Беларусь...**

— На Бута мы працавалі ў свой час. Гэта, канешне, асоба вядомая. Але што Бут? Гандляваў паціху. Натуральна, без падтрымкі моцных гэтага свету ён бы і паршывага паляўнічага патрона не змог бы нікому прадаць. З беларусамі Бут у апошні раз супрацоўнічаў у годзе 1995-м, можа, 1996-м.

**«НН»: Што адбывалася з лётчыкамі адразу пасля развалу СССР?**

— Тая запатрабаванасць на прафесію, якая існавала ў часы СССР, неадпаведная сённяшняй. У канцы 1980-х «Мінск-2» выконваў каля 200 рэйсаў у дзень, а цяпер «Белавія» добра калі выконвае два дзясяткі.

Глядзіш, здаецца, лятаў-лятаў чалавек, а пасля бац! — стаіць на прахадной, шлагбаумы падымае. Як правіла, гэта людзі з вышэйшай адукацыяй, няхай і авіяцыйнай, — усё адно гэта інжынерная адукацыя.

Ёсць і тыя, хто з пілоцкага крэсла прабіўся ў лік вельмі паспяховых бізнэсменаў. У аднаго майго былога калегі ўласная авіякампанія ў Венгрыі, напрыклад. Але гэта адзінкі — на прахадной нашмат болей стаіць.



Беларускія лётчыкі Ігар Вашкевіч і Іван Габ апошні раз у жыцці сфатаграфаваліся ў Самалі. Праз некалькі гадзін іхні самалёт будзе збіты, яны загінуць.

На базе нашай тэхнікі было арганізавана шмат кампаній і ў Афрыцы, і ў Азіі. Сфармавалася пэўнае кола людзей, якія змаглі браць гэтую тэхніку і рассоўваць яе ў дзіркі кшталту Анголы, Заіра, Конга. Там гэтая тэхніка была вельмі запатрабаваная. У той час ужо быў сфармаваны рынак з заходніх самалётаў, але яны каштавалі нашмат даражэй за савецкую авіятэхніку, якая хлынула пасля развалу СССР у той бок. Гэта былі каласальныя рэсурсы. Прычым тэхніка па тых мерках далёка не самая кепская.

**«НН»: Гэта праходзіла праз дзяржаўны бюджэт, ці прадавалі хто мог і куды мог?**

— Праз бюджэт. Я не сутыкаўся з поўным бясчынствам, прынамсі, у Беларусі. Ва Украіне, Расіі — так, гэта практыкавалася. Я ведаю выпадак, у годзе 1992-м, калі самалёт АН-8 набылі за пяць тысяч рублёў і скрыню каньяку. І самалёт да гэтага часу яшчэ лётае. Але гэта адзінкавы выпадак.

**«НН»: Што штурхае людзей на рызыкоўную працу ў гарачых кропках?**

— І рамантызм, і грошы. Хто пралётаў 10—15 гадоў, як правіла, жадае лётаць далей. З удалай камандзіроўкі можна прывезці некалькі тысяч ці нават дзясяткаў тысяч даляраў і пасля гэтага паўгода не працаваць...

**«НН»: У якім рэгіёне нашых лётчыкаў найбольш?**

Найбольш папулярнае месца — Афрыка. Туды, дзе нехта аднойчы пратаптаў сцяжынку, натуральна, стараюцца цягнуць сваіх. Проста ж барана не пасадзіш за штурвал — трэба людзі, якіх ведаеш, якім давяраеш.

Афрыка — гэта, вядома, своеасаблівы лад жыцця. І тая праца, якая там, вядзецца практычна без правілаў. Проста лётай у сваё задавальненне. А калі за гэта яшчэ і плацяць, чаму б і не? Нехта і ў Афрыцы няблага асіміляваўся і ўжо не ўяўляе сябе па-за гэтым колам.

Хтосьці прадае свае рукі, хтосьці прадае здароўе.

Зрэшты, хутка такая з'ява знікне, бо гэтым лётчыкам амаль усім каля пяцідзесяці — ім засталося лётаць некалькі месяцаў ці гадоў.

**Вольга Жарнасек**

## СЦІСЛА

### Школьнік упаў з 16-га паверха

Мінскі дзевяцікласнік загінуў, сарваўшыся з 16-га паверха жылога дома. Як мяркуецца, у юнака было рызыкоўнае хобі — паркур. Ён быў аматарам экстрэмальнага перамяшчэння па горадзе.

### Павесіўся першакурснік

Пракуратура Кастрычніцкага раёна Мінска праводзіць праверку па факце самагубства студэнта першага курса гістарычнага факультэта завочнага аддзялення Белдзяржпедуніверсітэта. Малады чалавек прыехаў у Мінск з Барысаўскага раёна на сесію. Жыў у сваякоў. Там жа яго знайшлі павешаным. Мяркуецца, што гэта самагубства.

### Пад Гроднам ліквідаваны гіганцкі самагонны бровар

Самая буйная за апошнія гады падпольная вытворчасць самагону ліквідаваная ў вёсцы Рыбніца. Міні-завод размяшчаўся ў аборы. Незвычайны апарат працаваў на поўную магутнасць. Яго канструкцыя была настолькі складанай, што для ліквідацыі былі выкліканы спецыялісты газавай службы. Пры ўзнікненні непаладак падчас вырабу самагону ўся вёска магла ўзляцець на паветра — у памяшканні знаходзілася 20 балонаў з газам. Канфіскавана 120 літраў самагону, знішчана больш як 5 тон брагі!

### Выносілі трыццаць батонаў каўбасы

20-гадовы грузчык мінскага мясакамбіната ў прыбіральні на тэрыторыі прадпрыемства схаваў 30 батонаў каўбасы на 400 тысяч рублёў. Дапамагчы вынесці дабро ён папрасіў двух сяброў. Яны чамусьці пайшлі праз прахадную. Пры спробе затрымання малады чалавек кінуўся бегчы, губляючы схаваную пад адзеннем каўбасу, і яму ўдалося ўцячы. Гора-злодзеям пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да чатырох гадоў.

### Мікрааўтобус лёг у кювет

Грузавы мікрааўтобус «Пежо-Баксёр» перакуліўся на выездзе з Маладзечна. На слізкай дарозе кіроўца няправільна выбраў хуткасць руху, машына з'ехала ў кювет і легла набок. Кіроўца і пасажырка абышліся спалохам.

### Нацягаў з шуфлядкі 5 мільёнаў

Міліцыя раскрыла крадзеж грошай з кватэры аднаго з дамоў Вілейкі. З шуфлядкі стала знікла 5 мільёнаў рублёў. Грошы цягаў 21-гадовы сябрук малодшага сына гаспадароў. Ён прыходзіў у госці часта, малады людзі гулялі на камп'ютары. Буйная сума ляжала ў шуфлядцы стала, на якім стаяў камп'ютар. Няўдзячнаму сябру пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

**СМ; БелаПАН, «Рэгіянальная газета»**

### Польская прастытутка зарабіла каля 5 млн даляраў

Падатковая служба прымусіла афіцыйна беспрацоўную жыхарку Катавіцаў выплаціць падаткі памерам 2,3 млн злотых ($820 тыс.). Прыбытак жанчыны ад заняткаў прастытуцыяй ацэньваецца ў 13,7 млн злотых ($4,86 млн).

Кабета заявіла, што ў яе былі шчодрыя кліенты. Так, адзін з іх заплаціў ёй больш за 5 млн злотых у перыяд з 1997 па 2002 год.

**Паводле wprost.pl**

# Беларускі і эстонскі ўніверсітэты: я адчуў розніцу

**Першы — Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе я вучыўся да 2008 года. Другі — Тартускі, у якім я навучаюся цяпер.**

Арганізацыю вучэбнага працэсу ў Тарту можна ахарактарызаваць выразам «ніхто не перашкаджае, але і за ручку не водзіць».

Атрыманне вышэйшай адукацыі, як і ўсюды ў Еўропе, падзеленае на два ўзроўні: бакалаўрэат — 3 гады і, пры жаданні, магістратура — 2 гады. Галоўнае значэнне маюць не адзнакі, а колькасць крэдытных пунктаў, якія неабходна набраць да канца навучання. Кожны прадмет мае сваю колькасць пунктаў. Частку прадметаў абавязкова трэба прайсці, і частку студэнт можа абраць па жаданні.

Студэнт самастойна вызначае, калі яму зручна праходзіць прадметы. Студэнт сам выбірае групу і час практычных заняткаў. Усё гэта дазваляе рабіць усвядомлены выбар і планаваць час. Жадаеш спаць больш — стаў прадметы на пазнейшы час, жадаеш зрабіць сабе не два, а чатыры выходныя ў тыдзень — паспрабуй скласці так свой вучэбны план. Не жадаеш праходзіць гэты прадмет сёлета — абяры яго ў наступным годзе.

Ніхто не кантралюе, няма журналаў груп, выкладчык не губляе часу на праверку, а дэкан не прыходзіць пасярод пары, каб праверыць выкладчыка, ці адзначыў ён адсутных. Чалавека з самага юнацтва прывучаюць да адказнасці.

У Гомелі ў мяне не было свабоды выбару. Колькі сказалі, гэтулькі і павінен прайсці прадметаў. Расклад складзены без уліку меркавання студэнтаў. Уся сістэма пабудаваная на тым, каб здушыць ініцыятыву, прызвычаіць студэнта да думкі, што ад яго нічога не залежыць. Пасля заканчэння ВНУ ён пойдзе на працу гатовым выконваць усе загады, трываць усе ўмовы.

У еўрапейскіх ВНУ акадэмічныя свабоды існуюць некалькі стагоддзяў. Выкладчык не абцяжараны ідэолага-выхаваўчымі справамі. Няма і ўпраўленняў ідэалагічнай і выхаваўчай працы з моладдзю з дванаццаці (як у Гомелі) чалавек.

**Студэнт самастойна вызначае, калі яму зручна праходзіць прадметы. Студэнт сам выбірае групу і час практычных заняткаў.**


Студэнты Тартускага ўніверсітэта.

Студэнты Тартускага ўніверсітэта могуць выязджаць за мяжу па любых пытаннях, удзельнічаць у палітычным жыцці, трымацца любых поглядаў. У адрозненне ад студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта (ГДУ), жыццё якіх пад поўным кантролем. У Тартускім універсітэце няважна, хто ты і што ты. Галоўнае — спраўляцца з вучэбнай праграмай, інакш будзеш адлічаны. Тут няма сістэмы завалюмаванага рабства ў выглядзе абавязковага размеркавання. Адсутнічаюць «суботнікі», абавязковыя сустрэчы з ветэранамі, службоўцамі, святарамі і праваслаўнымі атэістамі. Можа, таму Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт — «установа адукацыі», а Тартускі — проста ўніверсітэт?

Дарэчы, універсітэт Тарту ўваходзіць у прэстыжным рэйтынгу Times Higher Education-QS World University Rankings у лік найлепшых універсітэтаў свету.

Службоўцы Міністэрства адукацыі гавораць аб выключнай якасці айчыннай вышэйшай адукацыі. Але сваіх дзяцей яны адпраўляюць вучыцца ў краіны ЕС або ў ЗША.

Чаму так, можна зразумець, параўнаўшы сістэмы вышэйшай адукацыі — Балонскую, распаўсюджаную ў большасці краін свету, з беларускай.

**Ігар Случак, Тарту—Гомель**

# Крык аб дапамозе альбо нахабны аферызм?

**У «Народнай волі» я звярнула ўвагу на артыкул «Не осудите, а помогите».**

Гэта пісьмо было крыкам аб дапамозе. Яно мяне вельмі ўразіла.

Дапамогі прасіла мая зямлячка з Шаркаўшчыны, якая трапіла ў цяжкае становішча. Я адразу схапіла слухаўку і пачала званіць сябрам, каб разам дапамагчы жанчыне. Абтэлефанавала чалавек дзесяць, і, хаця ўсе яны людзі небагатыя, адразу згадзіліся з маёй просьбай дапамагчы Фёдаравай Святлане Імантаўне.

Але мяне стала непакоіць тое, што я недзе чытала ўжо ў друку такі тэкст. Праз хвілін дваццаць мне патэлефанаваў Ляскоўскі Уладзіслаў Канстанцінавіч і сказаў, што гэтая жанчына жыве лепш за нас усіх, што яна ніякая не маці-адзіночка, што ў яе ёсць працуючы муж.

На свята мы прыехалі пагасціць у Канстанцінавіча.

Гаворка, вядома, пайшла і пра Святлану Фёдараву. І тут Алег Сікора распавёў, што ягоная швагерка з Вілейкі прачытала той артыкул у газеце і тут жа вырашыла дапамагчы зямлячцы. Сабрала рэчы, якія былі дома, нешта прыкупіла. І вось яна прыехала ў Шаркаўшчыну.

Дзверы ёй адчыніла добра апранутая жанчына. Узяўшы прывезеныя рэчы, яна іх нават не пагледзела, адразу кінула ў кут і спытала: «А грошы прывезла?»

Алег казаў, што швагерка, прыйшоўшы да іх, плакала ад крыўды, зразумела, што старалася дапамагчы аферыстцы. Я добра ведаю, што беларусы добрыя людзі, спагадлівыя да чужой бяды. Часам яны і не ведаюць, што іх дабрынёй карыстаюцца такія ашуканцы.

**Гэтая жанчына жыве лепш за нас усіх.**

**Ганна Рымдзёнак — пенсіянерка, выхоўвае двух унукаў — круглых сірот. Але яна ні разу не папрасіла ні ў каго дапамогі. Жыве яна па суседству з Фёдаравай...**

Ганна Рымдзёнак — пенсіянерка, яна выхоўвае двух унукаў — круглых сірот, але яна ні разу не папрасіла ні ў каго дапамогі. Жыве яна па суседству з Фёдаравай, бачыць, як тая часта атрымоўвае паштовыя пераводы і пасылкі.

Пазваніла я знаёмай журналістцы, каб тая правяла журналісцкае расследаванне і аб гэтым расказала на старонках рэспубліканскага друку. Праз некалькі дзён яна мне распавяла, што Святлана атрымала пераводаў больш за чатыры мільёны беларускіх рублёў і 15 пасылак.

Так добрыя людзі хацелі перад Новым годам парадаваць «гаротніцу». Захацелася жанчыне пагутарыць са Святланай. Патэлефанавала ёй а дзясятай гадзіне. Тая яшчэ спала. На пытанне, чаму яна не працуе, адказала: «В Шарковщине нет для меня достойной работы». Напэўна, лепш ёй жыць так, за чужы кошт, ашукваючы людзей. Адзін і той жа тэкст яна змяшчае па чарзе ў беларускія часопісы і газеты.

Такое ўжо працягваецца гадоў пяць. Людзі, а можа пара сказаць ашуканцы: «Хопіць!»?

**Ада Райчонак, westki.info (Германавічы, Шаркаўшчынскі раён)**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

## 20 еўра — самая папулярная купюра сярод фальшываманетчыкаў

**Як адрозніць падробны еўра ад сапраўднага?**

У другой палове 2009 года ўлады Еўрасаюза канфіскавалі 447 тыс. фальшывых купюр еўра, што на 8% больш, чым у першым паўгоддзі.

Самая папулярная сярод фальшываманетчыкаў купюра — 20 еўра. На долю гэтых банкнот прыпадае палова ўсіх фальшывых грошай у зоне еўра.

На долю купюры ў 50 еўра ў нелегальным абароце прыпадае 30%, а для банкноты самай высокай вартасці — у 500 еўра — 0,5%.

Як вызначыць, ці сапраўдная купюра, што трапіла вам у рукі? Найперш, усе еўрабанкноты надрукаваныя на спецыяльнай баваўнянай паперы, якая навобмацак істотна розніцца ад звычайнай. Некаторыя выявы банкноты рэльефныя.

На прасвет мае быць добра бачны вадзяны знак — фрагмент сюжэта добрага боку банкноты і лічбавае абазначэнне наміналу. На прасвет бачная і схаваная ахоўная нітка — чорная вертыкальная лінія, што падзяляе добры бок банкноты напалам.

На ўсіх купюрах еўра ёсць галаграмы. На добрым баку купюраў у 5, 10 і 20 еўра гэта шырокая срэбная паласа. Пад розным кутом да свету на ёй бачныя сімвал еўра і пазнака наміналу купюры.

Сімвал еўра — стылізаваная літара Е з дзвюма гарызантальнымі лініямі пасярэдзіне, што сімвалізуюць цвёрдасць валюты. На купюрах буйнога наміналу на добрым баку можна бачыць галаграму, дзе пад розным кутом відаць лічба наміналу (50, 100, 200 ці 500) і выява адпаведнага архітэктурнага матыву.

**СМ**

## «КНІГАРНЯ «НН»

### Па-беларуску выйшла сакрэтная кніга польскіх спецслужб аб Беларусі

У 1928 г. у Варшаве выйшла кніга «Кароткі нарыс беларускага пытання», прызначаная для службовага карыстання агентамі польскіх спецслужб. Гэта кніга — найбольш поўны збор дакументаў і фактаў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху.

Выдавецтва «Логвінаў» выдала «Кароткі нарыс...» па-беларуску, з каментарамі і ілюстрацыямі.

Андрэй Вашкевіч, які разам з Алесем Пашкевічам і Андрэем Чарнякевічам рэдагаваў кнігу, кажа: «Гэта квінтэсенцыя гісторыі беларускага руху. Тут сабраныя ўсе галоўныя дакументы і факты».

**АП**



# Вочы

## палітыкаў



1. Ён атрымаў мянушку «апошняга дыктатара Еўропы».



2. За 37 гадоў яна зрабіла адну з самых хуткіх кар’ераў ва ўладзе. Цяпер у ейных руках знаходзіцца не толькі кантроль над ідэалогіяй краіны, але і намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі, шлюб з якім выклікаў нямала здзіўлення і чутак.



3. Гэты 47-гадовы палітык пачынаў жыццёвую дарогу трактарыстам у саўгасе на Стаўпеччыне. Пасля атрымаў дзве вышэйшыя адукацыі. Палітычную кар’еру пачаў як дэпутат. Аўтарытэт жа заслужыў як лідэр апазіцыі.



4. Пра гэтага 51-гадовага чыноўніка пэўна вядома толькі адно — ён быў савецкім разведчыкам. Сайт БЕЛТА не падае нават дакладнага месца ягонага нараджэння. Хоць доўгія гады ён адпрацаваў памочнікам Аляксандра Лукашэнкі, а цяпер займае адну з найвышэйшых пасадаў у краіне.



5. За свае 33 гады ён прайшоў ужо ссылку і турму. Чалавек-крэмень.



6. Яму 34 гады, і ўсе думаюць, што ён заменіць бацьку на ягонай пасадзе.



7. Ён пачынаў працаваць як звычайны электрык. А стаў прэм’ер-міністрам. Да пенсіі яму яшчэ 5 гадоў. Таму чуткі пра ягоную адстаўку могуць пераджыць яшчэ не адну пікейную камізэльку.



8. Яму 62 гады, пазнаюць яго па барадзе. Самы папулярны сярод апазіцыйных палітыкаў.



9. Яму 66. Ён айцец беларускай незалежнасці, які вывеў нацыянальную праблему на парадак дня палітыкі.

## бізнэсоўцаў



1. У свае 46 гадоў ён валодае кампаніяй «Трайпл», а для душы — таксама рэстарацыяй «Ракаўскі бровар» і футбольным клубам «Дынама-Мінск». Яго называюць «любімым прадпрымальнікам прэзідэнта».



2. У 43 гады ён займае 51-ю пазіцыю ў спісе найбагацейшых людзей свету. Не сыходзіць са старонак сусветных таблоідаў, выдаткоўваючы вялізныя сумы на яхты і футбольныя клубы.



3. Арганізатар шматлікіх дабрачынных фондаў, штогод гэты геніяльны інвестар выдаткоўвае на свае некамерцыйныя праекты каля 300 мільёнаў даляраў. Дзейнасць ягонага фонду была забароненая ў Беларусі ў 1997 годзе.



4. Ён заснаваў карпарацыю Microsoft, пасаду старшыні рады дырэктараў якой пакінуў у 2008 годзе, калі яму было 53. У перыяд ад 1996 да 2007 года і ў 2009 годзе ён быў самым багатым чалавекам планеты, паводле версіі часопіса Forbes.



5. 39-гадовы плэйбой кіруе прадпрыемствам па выпуску бялізны пад брэндам Serge і выдавецкай кампаніяй «Альянс-медыя». Адзначыўся мільённым пазовам супраць «Народнай волі», спробай знішчыць газету «Свободные новости».



6. Гэты 55-гадовы кіраўнік буйнога беларускага банка пазалетась агарошыў фінансавыя колы заявай, што ў Беларусі 7—10 тысяч даляравых мільянераў.



7. У 1990 годзе ён заснаваў Моладзевы вытворчы цэнтр «Атлант». Цяпер ягоны холдынг з’яўляецца абсалютным лідэрам на аўтарынку Беларусі.



8. Гэты 49-гадовы бізнэсовец распачаў сваю кар’еру ў галіне распрацоўкі праграмнага забеспячэння. У 1991 годзе эміграваў з Беларусі ў Амерыку і праз два гады заснаваў аўтсорсынгавую кампанію з штаб-кватэрай у Нью-Джэрсі. Абапіраючыся на праграмерскія кадры ў былым СССР, яна стала лідэрам на рынку вытворцаў праграмнага забеспячэння.

Гэта і «люстра душы», і адбітак пражытых гадоў, і праектар самых патаемных думак чалавека ды яго схаваных намераў. Прапануўваем паглядзець у вочы тых людзей, якія ўдзельнічаюць ў значных палітычных і культурных працэсах, уплываюць на беларускую і сусветную эканоміку. Лініі ці добрыя, шчыра расплюшчаныя ці хітравата прыжмураныя, яны могуць сказаць нам тое, што не заўсёды вымаўляецца ўслых.

Сто працэнтаў, што ў вачах адбіваецца характар і род заняткаў чалавека. Часта мы чуем: «палітыка — брудная справа», «бізнэс — суцэльны падман», «шоу-бізнэс — дзярмо», «няма гнілейшых людзей за інтэлігенцыю». Ці так гэта? Зірнем у вочы.

# інтэлектуалаў



**1.** Закаханасць у беларускую гісторыю, філіграннае валоданне стылем і сакавіта-грубаваты гумар зрабілі гэтага 56-гадовага пісьменніка адным з самых папулярных.



**2.** Пасля смерці Быкава гэты 74-гадовы паэт застаўся найвышэйшым маральным аўтарытэтам беларусаў.



**3.** 35-гадовы філосаф выдае экстрэмісцкі часопіс, які адны вінавацяць у прадажным касмапалітызме, а другія — у адмарожаным нацыяналізме.



**4.** 53-гадовы кіраўнік незалежнай лабараторыі аксіяметрычных даследаванняў «Новак».



**5.** 63-гадовы паэт — аўтар песень «Гуляць дык гуляць», «Гора за гарой», «Белае віно і чырвонае». Пасля дзесятка кніг паэзіі выдаў гучны раман «Лабух», галоўнай гераіняй якога лічаць Анжаліку Агурбаш.



**6.** 51-гадовы пісьменнік лічыць сябе найперш мастаком, але вялікіх поспехаў дасягнуў і ў бізнэсе. Шмат скандалаў разгарнулася пасля публікацыі ягонай кнігі «Дамавікамерон», у якой змяшчаецца шмат эратычных сцэн.



**7.** Узначальвае Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына».



**8.** У свае 37 гадоў ён самы вядомы ў Беларусі палітолаг, да думак якога прыслухоўваюцца і ў Беларусі, і ў замежных рашэннетворчых цэнтрах.

# шоу-бізу



**1.** У 32 гады яна якіх толькі чутак пра сябе ні пачула. Найбольш яна праславілася на канцэртах «За Беларусь». У 2007 годзе Аляксандр Лукашэнка падтрымаў піяр-кампанію «Яна — твар Беларусі». Між тым, голас яна сапраўды мае.



**2.** Кажуць, за свае 57 гадоў ён залежаў ад розных кепскіх звычак. Але для мільёнаў людзей ён застанецца аўтарам душэўных «Малінаўкі» і «Белага снегу».



**3.** Праз сваю любоў да беларускай мовы трапіў у няласку. Каб выйсці з яе, у 59 гадоў прыдумаў выканаць песню «Слухай бацьку!»



**4.** 37 гадоў. Спявае «Беларусь freedom» і «Ау-ау-ау, Я тебя все равно найду».



**5.** Расіец па нацыянальнасці, ён найлепш прачуў беларускую песню і спалучыў яе з самымі сучаснымі знаходкамі заходняй музыкі. Стварыў легендарны ансамбль, які застаецца візітоўкай Беларусі і праз 7 гадоў пасля ягонай смерці.



**6.** 23-гадовы ўлюбёнец лёсу нарадзіўся ў Мінску, але ад 1990 года жыве ў Осла.



**7.** 50-гадовы гродзенскі спявак і актор. Лічыцца бацькам «бруднага беларускага блюзу». А яшчэ ён геніяльна вядзе аўкцыёны, і сотні людзей загаварылі па-беларуску пасля ўдзелу ў таргах пад ягоным кіраўніцтвам.



**8.** Ёй 32 гады, і на сёння людзі лічаць яе Настассяй, хоць яна і Святлана.



**9.** Стала папулярнай, дзякуючы працы на радыё, але ейныя вочы зрабіла папулярнымі тэлебачанне.

# Вочы

## Вочы палітыкаў


1. Аляксандр Лукашэнка, кіраўнік Беларусі ад 1994 года.


2. Наталля Пяткевіч, першая намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі.


3. Анатоль Лябедзька, старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі.


4. Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей.


5. Павал Севярынец, былы палітвязень, сустаршыня Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі.


6. Віктар Лукашэнка, сын і памочнік А.Лукашэнкі па бяспецы.


7. Сяргей Сідорскі, прэм’ер-міністр Беларусі.


8. Аляксандр Мілінкевіч, лідэр Руху «За Свабоду».


9. Зянон Пазняк, лідэр Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ.

## Вочы бізнэсоўцаў


1. Юрый Чыж, кіраўнік кампаніі «Трайпл».


2. Раман Абрамовіч, расійскі мільярдэр.


3. Джордж Сорас, амерыканскі мільярдэр.



4. Біл Гейтс, амерыканскі мільярдэр.


5. Сяргей Атрошчанка, гендырэктар кампаніі «Serge».


6. Сяргей Касцючэнка, старшыня праўлення «Прыёрбанка».


7. Алег Хусаенаў, гендырэктар аўтахолдынга «Атлант-М».


8. Аркадзь Добкін, кіраўнік кампаніі EPAM Systems.

## Вочы інтэлектуалаў


1. Уладзімір Арлоў, пісьменнік.


2. Рыгор Барадулін, народны паэт Беларусі.


3. Валер Булгакаў, рэдактар часопіса ARCHE.


4. Андрэй Вардамацкі, прафесар-сацыёлаг.


5. Уладзімір Някляеў, пісьменнік.


6. Адам Глобус, пісьменнік, мастак і выдавец.


7. Алена Макоўская, старшыня Згуртавання беларусаў свету, каардынатарка кампаніі «Будзьма».


8. Віталь Сіліцкі, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.

## Вочы шоу-бізу


1. Ірына Дарафеева, спявачка.


2. Аляксандр Ціхановіч, спявак.


3. Анатоль Ярмоленка, спявак, лідэр «Сяброў».


4. Сяргей Міхалок, папулярны беларускі рок-музыка.


5. Уладзімір Мулявін, заснавальнік «Песняроў».


6. Аляксандр Рыбак, пераможца «Еўрабачання-2009».


7. Віктар Шалкевіч, бард, шоумэн.


8. Святлана Зелянкоўская, акторка, выканаўца галоўнай ролі ў фільме «Настасся Слуцкая».


9. Тамара Лісіцкая, зорка радыё і ТБ.

Вольга Жарнасек, Мікола Бугай; фота Юліі Дарашкевіч, Андрэя Лянкевіча, Антона Матолькі і photo.bymedia.net



# Анёлкі прызямліліся ў Мінску

Вайцюшкевіч стварыў дзіцячую праграму «Мой сябра анёлак».

Аматары творчасці Зміцера Вайцюшкевіча і WZ-orkiestra прызвычаіліся да ягоных калядных канцэртаў у КЗ «Мінск» 7 студзеня. Сёлета Вайцюшкевіч падрыхтаваў праграму «Мой сябра анёлак». Выступаў не сам, а з іншымі артыстамі. І не ў Малой, як звычайна, а ў Вялікай зале.

Паэт Арцём Кавалеўскі расказаў, як сястра натхніла яго напісаць нізку вершаў пра анёлкаў. Вытрымліваючы дрэс-код, большасць удзельнікаў канцэрта была ў белых строях, а хтосьці і з крыльцамі за спіной. Ксеня Мінчанка, Янка Маўзер, Наста Някрасава з Rock Folk, Галіна Казіміроўская з Concordia Chor (дарэчы, жонка спевака), Ганна Хітрык і Мікола Прылуцкі з Купалаўскага тэатра спявалі гісторыі пра анёлкаў. Пра анёлкаў-ахоўнікаў, разважлівых анёлкаў, пра іх мары і просьбы...

Дарослым падпявалі дзеці. У вольны ад спеваў час яны весяліліся на сцэне, бегалі між дарослых, раздавалі гледачам цукеркі з «будзьмаўскіх» торбачак.

Толькі часам у анёльскую тэму ўпляталіся недзіцячыя жарты. Разважаючы пра начальнікаў і анёлаў, Зміцер запытаў у Ганны Хітрык — няўжо і сярод начальнікаў ёсць трохі вышэйшыя за анёлкаў?

У фінале, пасля песні Ганны пра анёлка, які згубіў акуляры — самай пранізлівай і шчымлівай у праграме, — грымнула бадзёрая і жыццесцвярджальная «Хто з анёлкам пасябруе?» Вайцюшкевіч паклікаў на сцэну ўсіх дзяцей, і канцэрт канчаткова пераpос у дзіцячае свята.

На развітанне музыка запрасіў усіх прыходзіць на канцэрты «Я нарадзіўся тут» у лютым і сакавіку.

**Сямён Печанко**



## Памёр аўтар казкі «Вожык у тумане»

Пісьменнік-казачнік Сяргей Казлоў памёр у Маскве на 71-м годзе жыцця.

Апроч казкі «Вожык у тумане», Сяргей Казлоў напісаў гісторыі пра Ільвянятка і Чарапаху, якія спявалі ім жа складзеную песню «Я на сонейку ляжу».

Смерць наступіла ў выніку запалення лёгкіх.

Да таго як стаць прафесійным пісьменнікам, Сяргей Казлоў быў рабочым друкарні, настаўнікам спеваў, качагарам на цягніку, ездзіў у геалагічныя экспедыцыі, вадзіў экскурсіі ў пушкінскім музеі-запаведніку ў Міхайлаўскім.

**АГ**

# Пад Рагачовам згарэла 150-гадовая драўляная царква

Пажарам знішчана старажытная царква святога Мікалая Цудатворцы ў вёсцы Стары Крыўск Рагачоўскага раёна. Пад раніцу 5 студзеня мясцовыя жыхары заўважылі дым, што ішоў з храма, і выклікалі пажарных. Выратаваць драўляны будынак 1852 года не ўдалося. Падчас пажару ніхто не загінуў. У пракуратуры выказваюць здагадку, што гэта быў падпал.

**БелаПАН**



# Стамбул замест Вільні

8 студзеня былі прэзентаваныя тры гарады, якія ў 2010 будуць лічыцца культурнымі сталіцамі Еўропы. Гэта нямецкі Эсэн, а таксама ўся вобласць Рур; венгерскі горад Печ ды турэцкі Стамбул.



Даліна Рур вядомая сваёй вугальнай і сталеліцейнай прамысловасцю. Праўда, апошнія гады былі адзначаныя прамысловым занепадам у гэтай частцы Нямеччыны. Працуюць усяго чатыры шахты. Нягледзячы на індустрыйнае мінулае, рэгіён уражвае насычанасцю культурнага жыцця — 120 тэатраў, 100 канцэртных залаў і 200 музеяў.

Венгерскі горад Печ мае дзвюхтысячагадовую гісторыю, а раннехрысціянскі некропаль на яго тэрыторыі ўключаны ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. Гэты горад на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў увабраў у сябе культуру і Захаду, і Усходу.

Турэцкі Стамбул вядомы на ўвесь свет. За шматвяковую гісторыю горад быў рэзідэнцыяй 10 рымскіх, 82 візантыйскіх імператараў і 30 асманскіх султанаў. Музеі і гістарычныя славутасці Стамбула захоўваюць палову каштоўнасцяў і рэліквій краіны.

Цягам года ў гэтых гарадах пройдуць культурныя мерапрыемствы еўрапейскага маштабу.

Нагадаем, адной з культурных сталіц 2009 года была Вільня.

**СМ**



# Спявачка Лхаса памерла ў 37 гадоў

Здарылася тое ў навагоднюю ноч. Прычына смерці — рак цыцкі.

Лхаса нарадзілася ў ЗША. Яе бацька — мексіканец, маці — амерыканка з ліванскімі каранямі. Першы дыск Лхасы быў заснаваны на матэрыяле мексіканскіх народных песень і называўся La Llorona. Гэта імя аднаго з персанажаў ацтэкскай міфалогіі. Кружэлка прынесла маладой спявачцы папулярнасць. Яе палюбілі за дзіўны голас. Затым былі яшчэ альбом The Living Road і дыск без назвы. Крытыкі параўноўвалі творчасць Лхасы з песнямі Цэзарыі Эворы.

Апошнія два гады Лхаса правяла ў штодзённай барацьбе з хваробай.

**Кастусь Матушыч**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Дваццаць восем «Надзенек»




Вясковая лірыка. Рамансы, дрындушкі. «Новая Музыкальная Компания». 2009 г.

Ну хто не памятае «Надзеньку» — беларускі жорсткі раманс савецкіх часоў з «Народнага альбома» пра дзяўчыну-гаротніцу, якую спакусіў афіцэр ды з'ехаў на «Дальний восток»? Магчыма, прычыны яе папулярнасці, апроч жыццёвага сюжэта, у тым, што спяваецца песня без музычнага суправаджэння... На дыску «Вясковая лірыка», які выдала прадусарка Арына Вележ, такіх «Надзенек» аж дваццаць восем. Ён адкрывае маладаследаваны пласт беларускай культуры — вясковыя рэміксы гарадскіх песняў.

Пад сціплай вокладкай хаваюцца вакальныя развагі пра пакуты «Зоечкі» Касмадзям'янскай, лірычнае выкрыццё здрадлівай «гімназісткі, якая потым стала дантысткай, імея ўрачэбны дзіплом», горкая праўда пра парыжскі прытон... І песня «Сэрца, табе не хочацца спакою», сыграная на цымбалах.

«Гэта «Жорсткі раманс» па-беларуску, — кажа Арына Вележ. — Такія песні родзяцца, калі нашыя вясковыя бабулі трохі падвесяляцца і сядуць перапяваць пачутыя па радыё або ад прыбышоў шлягеры. Але ж робяць яны тое па-свойму: перарабляючы словы або мелодыю і дадаючы неймаверную сардэчнасць».

Песні, змешчаныя на дыску, — аўтэнтычныя. Гэта выкананыя вясковымі спевакамі і спявачкамі рамансы, прыпеўкі-дрындушкі, турэмны фальклор, танга і полькі, класічныя ўзоры савецкай папулярнай песні, пачутыя народам і пераапрацаваныя на свой, адметны манер. Ці ж не будзе гэты дыск крэольскіх песень ударам па нацыянальнай культуры? «Гэта паўнапраўны пласт нашай культурнай спадчыны, — спрачаецца Арына. — Трэба пазнаёміцца і з наіўнай творчасцю нашага народа, каб ведаць, што такое моц і магія купальскіх песняў».

**Ліза Кавальчык**

# Горад з магіламі беларускіх прэзідэнтаў

**У XIV стагоддзі чэхі наймалі беларусаў–военачальнікаў. У ХХ–м Прага стала цэнтрам беларускай эміграцыі. Алесь Пілецкі піша пра беларускую Прагу.**

Чэхія ніколі не была для беларусаў суседкай. Нават у сацыялістычныя часы сюды мала хто трапляў. З гэтай краінай знаёміліся, збольшага дзякуючы чэхаславацкім таварам. Аднак, нягледзячы на адносную аддаленасць, беларуская прысутнасць у Празе налічвае шмат стагоддзяў. Прычым прысутнасць зусім не намінальная.


Пражскі Град — рэзідэнцыя чэшскіх каралёў.

### Палітэмігрант Бутаўт Кейстутавіч і студэнт Войдат Бутаўтавіч

Першым жыхаром беларуска-літоўскіх земляў, сляды якога мы можам знайсці ў Празе, быў сын князя Кейстута Бутаўт. У 1365 годзе ён паспрабаваў захапіць уладу ў Вялікім Княстве Літоўскім, скарыстаўшыся тым, што бацька і дзядзька, вялікі князь Альгерд, ваявалі на Вальні. Але змову выкрылі, і Бутаўт ратаваўся ўцёкамі да крыжакоў, дзе быў ахрышчаны пад імем Генрыха. Дапамагаў у аперацыях супраць Вялікага Княства, падступаў з рыцарскім войскам аж пад сцены Вільні. А пасля, калі ўжо не быў патрэбны нямецкім рыцарам, бадзяўся па Еўропе. Трапіў у Прагу — сталіцу Святой Рымскай Імперыі, — дзе і прыжыўся ля імператарскага стала. Імя Бутаўта-Генрыха сустракаецца ў пераліку прыдворных імператара Карла IV з пазнакай «dux Lituaniae» — літоўскі князь.

Было гэта ў 1366 годзе. Цікава, што гадоў праз дваццаць у Прагу прыязджае і сын Бутаўта, Войдат. Які таксама хрысціўся ў каталіцтва і стаў першым вядомым з дакументаў беларускім студэнтам. Выдатная чэшская адукацыя дала плён: у 1401—1402 гадах Войдат зрабіўся рэктарам Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве. Другім па ліку. Заснавальнік універсітэта, кароль Ягайла, зрабіў пратэкцыю стрыечнаму пляменніку.

Пасля Крэўскай уніі пры двары польскай каралевы Ядвігі ўзнік праект навучання студэнтаў з Польшчы і ВКЛ у Карлавым універсітэце — Ягелонскі на той час быў у заняпадзе. У 1397 г. пры Карлавым універсітэце Ядвіга зафундавала калегіум — спецыяльны дом для літоўскіх студэнтаў, дзе яны былі цалкам забяспечаныя матэрыяльна. Але пасля смерці Ядвігі ў 1399 г. калегіум заняпаў — адказны за яго ўтрыманне чэх Ян Шцекна растраціў дзяржаўныя сродкі на ўласныя патрэбы. Наноў калегіум быў адкрыты толькі пасля смерці Яна Шцекны.

### Жыгімонт Карыбутавіч

Другім цікавым эпізодам беларуска-чэшскіх дачыненняў з'яўляецца гісторыя Жыгімонта Карыбутавіча — яшчэ аднаго пляменніка Ягайлы.

У 1420 годзе, калі памёр кароль Вацлаў IV, сын Карла IV, пачалася гусіцкая рэвалюцыя. Чэхі адмовіліся выбраць за караля брата Вацлава, Жыгімонта Люксембургскага. А паколькі сярэднявечная ментальнасць патрабавала прысутнасці ў дзяржаве манарха, яны звярнуліся да Ягайлы. Той адмовіўся быць чэшскім каралём — праблем хапала і ва ўласнай дзяржаве. Тады чэшскае пасольства паехала да вялікага князя Вітаўта. Ён прыняў чэхаў у Варнянах. Вітаўт пагадзіўся ўзяць іх карону, прызначыўшы ў Прагу намеснікам Жыгімонта Карыбутавіча, які быў адначасова пляменнікам як Вітаўта, так і Ягайлы.

У 1422 годзе Жыгімонт прыязджае ў Чэхію і пачынае абжывацца. Захоплівае горад Умічаў. З'яўляецца ў Празе. Лідэр гусітаў Ян Жыжка не адразу пагаджаецца з прысутнасцю намесніка Вітаўта, але паступова Жыгімонт Карыбутавіч заваёўвае павагу і сімпатыі гусітаў удалымі вайсковымі кампаніямі. Ён адбівае трэці крыжовы паход супраць Чэхіі. Спрабуе захапіць Карлштайн.

Гэты не самы ўдалы штурм увайшоў у гісторыю беларускай вайсковай славы як першы зафіксаваны выпадак выкарыстання біялагічнай зброі. Раз'ятраны ўпартасцю абаронцаў, Жыгімонт загадаў сваім ваярам закідваць непрыступны замак фекаліямі з дапамогай катапультаў. Выкарыстана было 60 вазоў гэтага рэчыва, але мужныя абаронцы не здаліся.

Намесніцтва Жыгімонта не было доўгім. Вітаўт адклікаў яго назад у 1423 годзе. Што, вядома, пляменніку не спадабалася. Таму Жыгімонт у 1424 годзе вяртаецца з уласнай ініцыятывы. У гэты час сярод гусітаў пачаліся спрэчкі. Памяркоўнае крыло нават каранавала Жыгімонта Карыбутавіча. Вось толькі ўлада яго абмяжоўвалася Прагай і блізкімі гарадамі.

Караляванне доўжылася тры гады. Жыгімонт спрабаваў знайсці паразуменне з суседнімі каталіцкімі дзяржавамі. Але ягонае ліставанне трапіла ў рукі пражанаў. Вынікам стала высяленне ў 1427 годзе Жыгімонта Карыбутавіча з яго каралеўскай рэзідэнцыі ў Старым горадзе. Прычым папярэдне гараджане нацягнулі няўдаламу дыпламату на галаву мех. Скончылася каралеўская эпапея Жыгімонта Карыбутавіча тым, што Вітаўт выкупіў пляменніка ў ганарлівых чэхаў у 1428 годзе. Пасля насельніцтва Прагі, як сведчаць летапісы, вельмі шкадавала аб учыненым перавароце. Існуе нават перакананне, што гераічны вобраз Яна Жыжкі на кані змаляваны з літоўскай «Пагоні» Жыгімонта Карыбутавіча.

### Скарына

З Прагай звязаныя два перыяды жыцця Францішка Скарыны. Першы перыяд — друкарскі. Скарына не меў уласнай друкарні ў Празе і карыстаўся паслугамі адной з сямнаццаці пражскіх. Зараз невядома, якой менавіта. Таксама складана сказаць, дзе дакладна ў Празе жыў наш першадрукар. Пажар 1547 года знішчыў гарадскія архівы... Аднак у самім паведамленні пра пажар згадваецца, што падчас яго згарэў дом Мацея Руса (альбо Русіна), які знаходзіўся на рагу Старамесцкай плошчы.

Другі перыяд жыцця першадрукара ў чэшскай сталіцы — батанічны. Каралеўскія сады і паркі Прагі былі закладзеныя ў пачатку XVI стагоддзя. Акурат у той час, калі ў дакументах сустракаецца імя каралеўскага садоўніка Францішка Скарыны. Фактычна, Скарына быў адным з заснавальнікаў гэтых садоў.

Чэшскім каралём быў тады эрцгерцаг Габсбург, які сядзеў у Вене. Захавалася перапіска з канцылярыяй пражскага Града, дзе выказвалася незадаволенасць садоўнікам. Маўляў, Скарына не рупіўся аб апельсінах.

Апошні вядомы дакумент, звязаны з жыццём Скарыны, — заклік чэшскага караля да сына першадрукара пераняць яго спадчыну. Скарынаў сын, паводле таго дакумента, жыў у Чэшскім Крумлаве, на поўдні краіны. Вядомае імя доктара Сымона Скарыны. Зараз складана з упэўненасцю сказаць, у якіх дачыненнях быў Сымон Скарына з Францішкам. Аднак найхутчэй менавіта ён быў тым сынам беларускага першадрукара. На жаль, сляды Сымона Скарыны губляюцца. Магчыма, што нашчадкі Францішка і сёння ходзяць па сярэднявечных вуліцах знакамітага Крумлава.



Помнік Францыску Скарыну ў Празе.

### Рада БНР

Але самым плённым для беларускай прысутнасці ў Празе стала ўсё ж ХХ стагоддзе. А дакладней, міжваенны яго перыяд. На гэты час прыпадае першая хваля беларускай эміграцыі ў Чэхію. Асобай, якая фактычна арганізавала прыезд беларускіх дзеячаў сюды, быў Мікола Вяршынін. Ён эміграваў з Расіі пасля рэвалюцыі 1905-га. Менавіта праз яго наладжваліся кантакты з чэшскімі ўладамі.

Сёння вельмі пашыранае ўяўленне аб тым, як чэхі з ахвотай дапамагалі беларусам. Рэальнасць крыху іншая. Чэхія ў 1920-я актыўна падтрымлівала ўсіх уцекачоў з былой Расійскай Імперыі — украінцаў, расійцаў і беларусаў. Беларусаў было мала ў параўнанні з іншымі — максімум некалькі соцень. У 1926 годзе толькі 82 нашыя землякі атрымлівалі стыпендыі ад чэшскага ўрада, а расійцаў — сем тысяч.

У 1923 годзе ў Прагу пераехала Рада БНР. Яна была зарэгістраваная ў Чэхіі як грамадская арганізацыя. І, паводле чэшскіх законаў, не магла займацца палітычнай дзейнасцю. Аднак чэхі на гэта заплюшчвалі вочы.

Існуе шмат міфаў адносна беларуска-чэшскіх міждзяржаўных адносінаў. Напрыклад, толькі зыходзячы з таго факту, што Масарык прыняў Луцкевіча, прынята меркаваць аб прызнанні Чэхіяй незалежнасці БНР. Аднак той жа Масарык у лісце да міністра замежных справаў Бенеша пісаў, каб ён не абяцаў шмат дэлегатам БНР, а падтрымаў непадзельную і дэмакратычную Расію. Што наўрад ці сведчыць аб прызнанні Масарыкам незалежнасці Беларусі.

У Празе існаваў асяродак, дзе беларусы маглі цешыцца сваімі ідэямі і ім ніхто ў гэтым не перашкаджаў. Стварaліся культурніцкія і студэнцкія арганізацыі, дзейнічаў урад БНР у выгнанні.


Магіла Пятра Крачэўскага.

Сёння аб тых часах нагадваюць магілы на знакамітых Альшанскіх могілках Прагі, дзе пахаваныя прэзідэнты Рады БНР Васіль Захарка і Пётра Крэчаўскі. Тут жа знайшоў спакой і спявак Міхась Забэйда-Суміцкі. Кур'ёзна, але многія запісы ягоных твораў былі знішчаныя ў 1968-м, падчас усплёску нявасці да Расіі сярод пражанаў...

Пасля вайны Альшаны сталі тым месцам, дзе гуртаваліся беларусы. Іх засталося мала — шмат хто скарыстаўся магчымасцю перабрацца далей на Захад. А тыя, што засталіся, збіраліся ў памятныя дні ля магілаў вядомых беларусаў. Чым не прамінулі скарыстацца чэхаславацкія спецслужбы. Яны адсочвалі людзей, якія прыходзілі на магілы, арыштоўвалі іх і адпраўлялі ў СССР.

Магілы прэзідэнтаў і сёння гуртуюць беларусаў Прагі. Сярод іх усё больш студэнтаў і моладзі, якія з'ехалі з ужо незалежнай Рэспублікі Беларусь.

**Фота аўтара**

Аўтар выказвае падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу Паўлу Котаву

# Знакі прыпынку

**Уладзімір Някляеў.** Запісы.
Пра Казуліна, Працьку, Танка, Кузняцова, А.А...

На гадавіне па Будзінасу ў Дудутках спаткаўся, нарэшце, з Казуліным, з якім не бачыўся з дня пахавання ягонай жонкі. Ён і тады ўжо быў ціхі, а цяпер зусім сцішэў. Не Казулін, а цень ягоны.

«Турма — не маці», — во што праўда.

Пытаюся: «Ты здароўем сваім пасля турмы займаўся? Хоць які-небудзь медагляд зрабіў?..» Аказалася, не. Дома рабіць асцерагаецца, а за мяжой ніхто не прапануе. Ні амерыканцы, да якіх толькі што ён злятаў па запрашэнні іх прэзідэнта (дарэчы, білет на самалёт для героя барацьбы з апошняй еўрапейскай дыктатурай, запрошанага прэзідэнтам ЗША, — эканомклас, ногі не выцягнуць), ні немцы, якія раней, калі ён быў яшчэ ў турме, абяцалі малочныя рэкі й кісельныя берагі. Папрасіў мяне з кім-небудзь пра гэта (медагляд) перагаварыць, самому няёмка.

Найістотнае, як мне здалося, чаго ў ім не стала, — штоімгненнай зацікаўленасці ў самім сабе. Гэта небяспечна для любога і кожнага, а ўжо для публічнага чалавека, палітыка...

Назаўтра я патэлефанаваў Мілінкевічу, каб сустрэцца... Мілінкевіч, падобна было, чакаў ад сустрэчы нечага большага, але, калі я сказаў, што прыйшоў толькі з адным: з праблемай здароўя Казуліна — не здзівіўся. Ці пастараўся не здзівіцца і абяцаў дапамагчы. Як мне здалося, шчыра.

Для палітыка галоўнае не тое, хто ён ёсць, а тое, кім ён здаецца. У гэтым Мілінкевіч у Казуліна значна выйграе (як Лукашэнка ў іх абодвух — і ва ўсіх).



* * *

Неяк з Максімам Танкам ішлі мы па прынарачанскім лесе і выйшлі на дзіўны ўзлесак, дзе кружком, нібы ў даўнім друвіскім танцы, стаялі ці не ўсе дрэвы, якія толькі ёсць у Беларусі: бяроза, ясень, елка, дуб, сасна... Яўген Іванавіч паказаў кійком на прагал у тым крузе: «А вось гэтае месца нібы чакае, калі на ім вырасце клён».

Праз гады, калі Максіма Танка ўжо не стала, апынуўся я ў тым жа прынарачанскім лесе, выйшаў на той дзіўны ўзлесак і ўбачыў на тым месцы, на якое паказваў Танк, малады клёнік... Не думаю, што Яўген Іванавіч сам пасадзіў яго, каб праз гады мяне здзівіць.

* * *

Юрый Кузняцоў прыехаў у Мінск, каб спаткацца з Г.Б. Пры сустрэчы я спытаў: «Ты праўда толькі дзеля гэтага?..» Ён адказаў: «Нават мімалётная закаханасць закідвала мяне на Сахалін».

Ну, можа быць. Хоць што да мяне, дык як толькі адкрывалася, што тая, якая мне глянулася, штосьці там рыфмуе ці спрабуе рыфмаваць, я мімалётна знікаў.

Праз дзень ці два сядзім у бары гатэля «Юбілейны». Кузняцоў ужо не ў тым настроі, каб «закідвацца на Сахалін», гаворым пра адцягненае. Да нас — яўна з намерам, каб я пазнаёміў яго з Кузняцовым, — падыходзіць А. А., якога ведаў я з часоў літаб'яднання пры газеце «Знамя юности». Вітаецца і гэтак па-свойску, паблажліва пытаецца ў мяне: «Ну? Как поживает матчына мова?» На што Юрый Палікарпавіч касмічна-запаволена, як толькі ён гэта ўмеў рабіць, уздымае вочы, глядзіць і пракідвае: «Пайшоў на х..!»

Калі расійскамоўны мінскі паэт А.А., для якога рускі паэт Юрый Кузняцаў як быў, так і застаўся недасяжнай зоркай, пайшоў туды, куды яго паслалі, я спытаў Кузняцова, скуль ён яго ведае? Аказалася, ні скуль. Першы раз бачыць. «Але ў профіль, — кажа, — відаць, што мудак і графаман».

У геніяльных паэтаў геніяльная інтуіцыя.

«Гэта глыбінна і прынцыпова важна, што ў беларусаў язык ёсць язык, а мова ёсць мова, не змешана боскае і зямное», — сказаў мне аднойчы імперскі расійскі паэт Юрый Палікарпавіч Кузняцоў.

* * *

Таццяна Працька цяпер (красавік 2008) у ЗША (у сям'і дачкі). На 11 траўня прызначаны з'езд БХК, на якім павінны прыняць яе адстаўку і абраць новага старшыню. Але заявы Працькі няма, ёсць толькі жаданне пакінуць пасаду, выказанае ёй у прэсе. І на пасяджэнні назіральнай рады Аляксандр Сасноў узняў дэбаты: насамрэч сыдзе Працька з пасады старшыні, ці ў апошні момант (як яно ўжо здаралася) адмовіцца? Маўляў, калі яна сыходзіць — гэта адзін з'езд, калі застаецца — іншы, дык да якога з'езду рыхтавацца?

У дэбатах тых было малавата... ну, скажам, этыкі, і, тым не менш, я ўзяў у іх удзел, даводзячы, што Таццяна, наколькі я ведаю яе, не можа зрабіць таго, чаго асцерагаецца рада: сказаўшы, што сыходзіць, застацца. Нехта згадзіўся са мной, нехта — не, а Сасноў спытаў: «А скуль ты можаш ведаць, наколькі ты яе ведаеш?..» Я паглядзеў на яго (колішняга міністра), на Грыба (колішняга генерала і спікера парламента), на Бураўкіна (колішняга старшыню камітэта Белдзяржтэлерадыё)... на ўсіх, хто там яшчэ быў, і, што-кольвечы пра іх успомніўшы, падумаў: «А праўда што...»

І адразу ж ніякавата стала, што так падумаў.

Таццяна Працька і муж яе Зміцер Козыр збудавалі ў Смалявічах, побач з якімі жывуць, касцёл. Не кавярню ці краму, а храм.

Месцам будоўлі стаў гарадскі сметнік, дзе цяпер — побач з храмам — парк і кветнік.

Касцёлу далі імя святога Валянціна.

Чаму?

Таму што Зміцер з Таццянай закаханыя. У Бога, у жыццё, у прыгажосць і адно ў аднаго. Вось скуль я магу ведаць, наколькі я іх ведаю.

* * *

Калі туманам наплываюць настальгічныя ўспаміны пра савецкае мінулае, дзе я, найчасцей, стаю на сцэне перад тысячамі людзей, дастаткова чвэрць гадзіны пагартаць «Архіпелаг Гулаг» — і туман сплывае. І тыя тысячы людзей — зэкі, а я пастаўлены на сцэну лагерным начальствам туманіць ім мазгі.

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**



## ТРЫНАЦЦАЦЬ СПОСАБАЎ УБАЧЫЦЬ ФЛІКЕР

1.
Убачыўшы гэта, туземцы здурэлі ўшчэнт.
З такіх удалых абменаў усё й пачалося.
Піраты, набіўшы золатам трум, адплылі на кантынент.
Мясцовы шаман глядзеў наўздагон, флікер вісеў у носе.

2.
Яна мела восем гадоў і на твары восем радзімак.
Я, аскубаўшы свой ровар, аддаў ёй пяць катафотаў —
чырвоны й чатыры аранжавыя — за здымак
і не знайшоў трох радзімак на гэтым фота.

3.
Яна ў кароткай-кароткай спадніцы ішла паўз шашу,
а ён у доўгім-доўгім прычэпе вёз дровы.
Ён выкруціў шыю й адчуў, як каханне займае душу,
убачыўшы флікер на ейным калене — за хвілю да катастрофы.

4.
Ён зрабіўся дарожным рабочым, яна вырасла ў порнамадэльку,
ды, сустрэўшы яго на трасе, яна ўспомніла, што ў іх было —
і ажно засвяцілася, перш чым заплакаць яму ў камізэльку.
І палоскі на камізэльцы адбівалі яе святло.

5.
Вось як было: яна згубілася ў лёхах, шукаючы скарбы,
а я шукаў калійную соль — і трапіў у тую ж яму.
Святло маёй лямпы ўпала на флікер у выглядзе лялькі Барбі —
і лялька сказала «мама». Так я знайшоў тваю маму.

6.
Яго шаблязубая ўсмешка рэкламавала кальцый,
гальштук сядзеў на шыі, як матылёк-аднадзёнка,
флікер колеру золата на безыменным пальцы
хаваў ад жаночых вачэй белы след ад пярсцёнка.

7.
У той вечар ён мог апраўдацца, бо чорны волас на ложку
выдаў за свой, пад падушкай стрынгі й панчошку —
за падарунак, набыты для жонкі сёння ў абед, у пярэрве…
Але гэты флікер яна сама падаравала той сцерве!

8.
Ад цябе застаўся дэкадны на тралейбус, чытацкі білет,
два білеты ў мінскую оперу (мы тады не пайшлі на «Фігара»),
зачытаны раман «On the road» і бліскучы твой амулет —
«All you need is love». Як ты там, на дарозе, — без мяне, без кахання, без флікера?

9.
Яе дэкальтэ было самым глыбокім на паэтычным кангрэсе,
а бэджык толькі крыху сцягваў яго краёчкі.
І кожны паэт нахіляўся імя прачытаць — і трэсся,
бо бэдж пачынаў свяціцца словам «аёечкі!»

10.
Паэт уцякаў ад сябе ва ўнутраную Манголію,
пакуль мянты не запёрлі ва ўнутраны Улан-Батар.
Калі фатаграфаваўся, вясёлы і гладка паголены,
зубамі адбіў 32 фотаўспышкі. Зубасты быў літаратар.

11.
Восень. Сышоў патрыярх. Сыходзяць прэм'еры і спікеры.
З мокрай альтанкі сыходзіць бяздомны Лёха.
Падае. З дрэваў у парку падаюць жоўтыя флікеры —
і бяздомнаму Лёху мякка, светла і лёгка.

12.
Я прысніў дзявятае неба, а там — Піфагор магутны:
у руках яго — струны святла й медыятар трохкутны,
у нагах — Малевічы з флікерамі, як музы —
і сума квадратаў роўная квадрату гіпатэнузы.

13.
«Ведаеш, Дзіма, — сказала першая зорка
першага Б, пакуль ён ранец ёй нёс, —
на тваім ранцы — флікер-зайчык, на маім — флікер-вавёрка:
я ўбачыла — і зразумела, што гэта лёс!»

**khadanovich.livejournal.com**



**Бітва снежкамі**

**17 студзеня** — чарговая пацеха ад арганізатараў бітваў падушкамі. **У 19.00 у парку Янкі Купалы** адбудзецца вялікі бой снежкамі. З сабой, акрамя добрага настрою, пажадана мець цёплыя пальчаткі, лепш не адну пару. Калі надвор'е паспрые, акрамя бітвы снежкамі, можна будзе пазабаўляцца лепкай снегавікоў. Арганізатары будуць у касцюмах зайцоў і на месцы растлумачаць правілы забавы.

## КАНЦЭРТЫ

**Фестываль «Можна!»**

**22 студзеня ў 20.00 у клубе «Рэактар» (вул. Харужай, 29)** пройдзе фестываль актуальнай беларускай музыкі «Можна!». Выступаюць: **«Срэбнае вяселле»**, **«Адыс Абеба»**, **«Нагуаль»**, **«Касіяпея»**, **Botanic Project**, **«ПартМоне»**, **CherryVata**. Квіткі: 30— 50 тысяч рублёў. Даведкі па т.: (029) 700–22–44, (029) 603–40–02.

**Let's Rock**

**16 студзеня ў мінскім клубе «Чэлсі» (вул.Няміга, 36)** пройдзе канцэрт Let's Rock. Выступаюць: **«Мутнае вока»**, **ZigZag**, **Blagi mat!!!**, **InVino**, **«Нарвегія»**. Квіткі: 10—15 тысяч рублёў. Даведкі па т.: (029) 291–38–25, (029) 274–61–12, (029) 640–56–12, (025) 952–83–24. **Пачатак у 19.00.**

**Аляксей Шадзько**

**20 студзеня ў 19.00 у КЗ «Мінск» (Малая зала)** выступіць Аляксей Шадзько пры ўдзеле Уладзіміра Ткачэнкі і Ігара Леўчука. Даведкі па т.: (029) 671–58–65, (029) 254–49–09.

**Карнавал у «Белай вежы»**

**14 студзеня у клубе «Белая вежа» (вул.Машэрава, 17)** пройдзе трагічны карнавал з хэпі-эндам, прысвечаны «старому новаму году». Будуць **Akana NHS**, **Маланка Orchestra**, **«Разбітае сэрца пацана»**, **Сергей Пукст**. Квіткі каштуюць 20—30 тысяч рублёў. Даведкі па т.:(017) 284–69–22, (029) 760–59–62.

**«Адыс Абеба» ў «Графіці»**

**17 студзеня а 19-й у «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — канцэрт растаманскага гурта з Гомеля «Адыс Абеба».

**Real Jazz Band**

**20 студзеня а 19-й у «Графіці»** — вечар джаза. Грае Real Jazz Band.

**Madera Hard Blues & White Night Blues**

**21 студзеня а 19-й у «Графіці»** — Madera Hard Blues & White Night Blues

## ІМПРЭЗЫ

**Стары Новы год у Цёткі**

**15 студзеня** паэтычны тэатр «Арт.С» прадстаўляе вечарыну-маскарад«Стары Новы год у Цёткі» з удзелам народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч. **Пачатак у 18.00 у бібліятэцы імя Цёткі (вул. Талбухіна, 12а).** Уваход вольны.

**Ікона і беларускае мастацтва**

**У клубе грэка-каталіцкай інтэлігенцыі (вул. Арджанікідзе, 6)** лекцыю на такую тэму прачытае **15 студзеня** прафесар Юры Хадыка. **Пачатак а 19-й.**

## ВЫСТАВЫ

**Юдаль Пэн**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** праходзіць выстава карцін Юдаля Пэна. Выстава прымеркаваная да 155-годдзя з дня нараджэння мастака. На ёй выстаўленыя 33 працы са збораў Віцебскага краязнаўчага музея. У Мінску яны экспануюцца ўпершыню. Гэта пейзажы, эцюды, партрэты. Менавіта ў партрэце мастак змог найбольш яскрава выразіць сваё майстэрства. Пэн здолеў адналькава ўдала перадаць характар як арыстакраткі на палатне «Дама з муфтай», так і стварыць вобраз сумнага «Старога палкоўніка з мундзірам». Сярод вучняў Пэна былі Марк Шагал і Заір Азгур. **Выстава працуе да 31 студзеня.**

**Шчодры куфар**

**У Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20) да 26 студзеня** працуе выстава «Шчодры куфар», на якой дэманструецца мастацтва пляцення з саломкі, роспісу і інкрустацыі куфраў саломкай.

**Светлае Свята Раства**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 14 лютага** працуе мастацкая выстава Валянціны Шоба «Светлае Свята Раства».

**Выстава адной карціны**

**Да 6 лютага ў Мастацкім музеі** ў рамках праекта «Выстава адной карціны» экспануецца палатно Івана Айвазоўскага «Ноч на востраве Родас».

**Снежны ком**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 17 студзеня** працуе выстава арт-аб'ектаў з лямцу «Снежны ком». З лямцу выраблены пано, вазы, насценныя модулі, а таксама ўжо знаёмыя многім лямцавыя ўпрыгожанні, шалікі, цацкі.

**Поўдзень вакол**

**У галерэі «Свет фота» (вул.Прытцкага, 10) да 20 студзеня** працуе выстава «Поўдзень вакол» Надзеі Дзегцяровай. Паўднёвая тэма з'яўляецца для фатографа адной з любімых.

**Выставы Генадзя Сухамлінава і Мікалая Андруковіча**

**У Палацы Мастацтва (вул. Казлова, 3) да 17 студзеня** працуе персанальная выстава твораў Генадзя Сухамлінава, прымеркаваная да 60-годдзя мастака. **Тамсама да 17 студзеня** працуе персанальная мастацкая выстава Мікалая Андруковіча, прымеркаваная да 50-годдзя мастака.

## ТЭАТРЫ

**14 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Стваральніца цуду»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта»

**15 студзеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»
**Тэатр оперы і балета** — «Карміна Бурана. Кармэн-сюіта»
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»

**16 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Прыгоды Пін-Піна»
**Тэатр юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «П'емонцкі звер»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**17 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр оперы і балета** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Тэатр оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**18 студзеня**

**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»

**19 студзеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла ды іншыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Чужое багацце нікому не служыць»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Іванаў»




**Купалаўскі тэатр** — «Больш чым дождж»
**Тэатр юнага гледача** — «Мешчанін у шляхецтве»

**20 студзеня**

**Тэатр оперы і балета** — «Спячая прыгажуня»
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Кабала святош (Мальер)»

**21 студзеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Чычыкаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»

**22 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Сіні аўтамабіль»
**Тэатр оперы і балета** — «Спартак»
**Купалаўскі тэатр** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**23 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Тэатр оперы і балета** — «Трубадур»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошні двубой»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»

**24 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр оперы і балета** — «Чыпаліна»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр оперы і балета** — «Алека»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Карусель»

## КІНО

# Прынцэса-жабка для Барака Абамы




**Прынцэса і жабка** (The Princess and the Frog)
ЗША, 2009, каляровы, 88 хв.
Рэжысёры: **Рон Клементс, Джон Маскер**
Жанр: **Анімацыйная музычная казка**
Адзнака: **6 (з 10)**

Цемнаскурая дзяўчына Тыяна марыць адкрыць свой рэстаран. На карнавале яна знаёміцца з жабкай-прынцам, якога зачараваў злы вядзьмак. Але пасля пацалунку дзяўчына сама станецца амфібіяй…

Карціна Рона Клементса і Джона Маскера — амаль забытая, намаляваная ад рукі анімацыя. У сённяшнія камп'ютарныя часы студыя «Дыснэй» вырашыла ўзгадаць пра вытокі. Рэжысёрам, якія працавалі над «Аладзінам» і «Русалачкай», гэта прыйшлося даспадобы.

Класічны казачны сюжэт, пацешныя персанажы. Героі спяваюць, танчаць, гарэзяць.

Карціна настальгуе па Новым Арлеане 1920-ых. Палітыка таксама праточваецца ў фільм: тата героіні нагадвае Барака Абаму.

Актуальная і дэмакратычная мараль. Прынцам-лавеласам варта вучыцца працаваць. Жабкам-працагалічкам — кахаць.

Мілая стужка.

**Андрэй Расінскі**

# «Аватар» у 3D

У Мінску наноў адчыняецца кінатэатр «Кіеў», дзе можна паглядзець кіно ў фармаце Dolby 3D. Першай стужкай, паказанай ў трохмерным выглядзе, стане «Аватар» Джэймса Кэмерана.

«Кіеў» пакуль першы ў Беларусі пераабсталяваны пад 3D-фармат кінатэатр. Фільмы ў 3D глядзяць у спецыяльных акулярах, з дапамогай якіх у гледачоў стварается ілюзія аб'ёмнасці таго, што на экране.

12 і 13 студзеня ў кінатэатры «Кіеў» гледачам пакажуць па адным сеансе «Аватара». Ад 14 студзеня кінатэатр будзе працаваць у звычайным рэжыме — два сеансы ў будні і тры ў выходныя. Графік працы будзе змяняцца ў залежнасці ад працягласці кінастужак.

**ВЖ**

# Перажыць катастрофу ў кінатэатры

**У Беларусі з'яўляюцца кінатэатры фармату 5D. Яны забяспечваюць гледачу поўнае занурэнне ў кінарэальнасць.**

### Новае вымярэнне кінаадчуванняў

5D-кінаатракцыёны ўпэўнена крочаць па Беларусі. Колькі каштуе сумнеўнае шчасце быць абсыпаным пяском і аблітым вадой? Каля 10 тысяч рублёў за пяць хвілін экстрыму. Новыя 5D-кінаатракцыёны дазваляюць адчуць эфект поўнай прысутнасці. Цяпер герой фільма і глядач — адна і тая ж асоба. Калі нехта на экране з шалёнай хуткасцю ляціць па трасе, то і глядацкае крэсла будзе гойдацца і ледзь не ўзлятаць падчас разгону, а ў вочы будзе біць струмень паветра. «Супер-8», «Ледзяныя гонкі», «П'яныя рэйкі», «Іншапланетнае сафары» — назвы фільмаў кажуць самі за сябе. Гэта кіно па форме і атракцыён па сутнасці.

### Эвалюцыя кіно

Кінамастацтва трапіла ў новае вымярэнне. Яго можна назваць і 4D, і 5D. Што было раней? Тыя фільмы, што транслююцца па тэлевізары ці ў звычайных кінатэатрах, адносяцца да вымярэння 2D — у іх ёсць выява і гук. Залы, у якіх на ўваходзе выдаюць спецыяльныя стэрэакуляры, паказваюць фільмы з імітаванай стэрэавыявай. Гэта 3D.

Наступнай прыступкай кінаэвалюцыі стала рухомае крэсла, якое імітуе фізічныя эфекты, напрыклад, распырсквае ваду. Калі ж глядач цалкам занураецца ў атмасферу фільма, калі імітуюцца нават пахі, якімі ахутаны герой стужкі, — гэта і ёсць самае сапраўднае 5D.

### Запрашаюцца худыя гледачы

У Беларусі такія кінаатракцыёны ёсць у Мінску, Магілёве, Маладзечне, Барысаве і Гродне. Два з тых кіназалаў прыватныя — магілёўскі і той, што ў мінскім ГЦ «Экспабел». Астатнія належаць дзяржаўнаму «Кінавідэапракату». Агульны кошт залы з апаратурай і кінастужкамі складае 120—130 тысяч даляраў.




Вызначыць, якія з пералічаных атракцыёнаў можна назваць сапраўдным 5D, складана. Напрыклад, у большасці старых будынкаў савецкіх кінатэатраў па тэхніцы бяспекі забаронена разліваць ваду. Няма й водараў вясновага лесу ці марскога ўзбярэжжа.

5D-кіно, якое паказваецца ў Беларусі, складана назваць фільмамі. Хутчэй гэта ролікі. Сеанс працягваецца ад трох да пяці хвілін. Зрэшты, больш гледачы і не вытрымліваюць... У зале звычайна ўсталявана ад пяці да васьмі крэслаў.

Абмежаванні для гледачоў тыя самыя, што пры наведванні экстрэмальных атракцыёнаў. Цяжарным жанчынам, малым дзецям, асобам са слабым вестыбулярным апаратам наведваць 5D-кіно не рэкамендуецца. Не пусцяць і тых, хто важыць больш за 100 кг, — крэсла можа не вытрымаць.

**Ягор Марціновіч**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Суп як бы з чарапахі (a la tortue)

*800 г ялавічыны, 400 г цяляціны, 1 цялячая галава, палова курыцы, 200 г шынкі, соль, 1 шклянка мадэры, 1—2 цыбуліны, 2—3 морквы, 1—2 пятрушкі, 0,5 сельдэрэю, 0,5—1 парэй, 100 г масла, 5—8 гваздзікоў, 10 зярнят англійскага перцу, 0,75 шклянкі пшанічнай мукі, 1 лімон, 5—10 труфеляў або шампіньёнаў, амарэткі* або бялкі ад вараных яек.*

Булён для гэтага супу павінен быць моцны, прыгатаваны з некалькіх гатункаў мяса, а менавіта з ялавічыны, цялячай лапаткі, цялячай галавы, курыцы, падсолены і з наборам карэння. Прыгатаваўшы, яго трэба працадзіць і старанна сабраць тлушч. Узяць 100 г свежага масла, растапіць і ўсыпаць ў яго сырую вэнджаную шынку, нарэзаную кубікамі, пакрышаную пятрушку, цыбулю, гваздзікі, англійскі перац, падсмажыць гэта на невялікім агні, потым усыпаць муку найвышэйшага гатунку і зноў падсмажыць. За паўгадзіны да таго, як падаваць на стол, усё гэта трэба ўліць у булён і давесці да кіпення, увесь час памешваючы. Калі закіпіць, працадзіць праз густое сіта, дадаць трохі амарэтак, кавалачкі цялячай галавы, труфелі або шампіньёны, яшчэ раз закіпяціць, дадаўшы шклянку мадэры, і падаваць. У талеркі пакласці па кольцу лімона.

Калі няма труфеляў і шампіньёнаў, суп можна падаваць і без іх, а замест амарэтак пакласці бялок ад некалькіх вараных яек (жаўткі ў гэты суп не кладуць).

* Амарэткі — гэта шпік з костак ялавічыны ці бараніны, адвараны на працягу 3—4 хвілін і нарэзаны на кавалкі. Раней гэта быў папулярны дадатак да розных страваў.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

## Мабільнікі не выклікаюць рак мозгу

**Колькасць выпадкаў раку мозгу з пачаткам выкарыстання мабільнікаў не павялічылася. Да такога вываду прыйшла група навукоўцаў з Дацкага таварыства барацьбы з ракавымі захворваннямі.**

Навукоўцы вывучылі ўзровень захворвання на рак мозгу ў людзей ад 20 да 79 гадоў з Даніі, Фінляндыі, Нарвегіі і Швецыі. З тых часоў як мабільнікі сталі даступнымі, падвышэння ўзроўню не адбылося.

Раней былі думкі, што электрамагнітнае поле, якое ўтвараецца падчас размовы па мабільным, можа стаць фактарам рызыкі.

**СХ**



## Улады Нью-Ёрка змагаюцца з соллю ў прадуктах

**Яны распрацавалі законапраект, які абавяжа скараціць ужыванне солі. Ён распаўсюдзіцца на рэстаранныя стравы і паўфабрыкаты ў супермаркетах.**

Мэта — зменшыць салёнасць на 25% за пяць гадоў.

Мэта гэтай ініцыятывы — барацьба з сардэчнымі прыступамі і высокім крывяным ціскам з дапамогай скарачэння ўжывання харчовай солі ў прадуктах.

Вытворцы па-рознаму адрэагавалі на гэтую ініцыятыву. Многія паведамілі пра падтрымку гэтага рашэння, але знайшліся і крытыкі. Яны кажуць, што гэта чарговая спроба ўвядзення рэгулявання ў сферы, дзе рашэнне павінна прымацца добраахвотна.

**НБак**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Любага сябра Франака Вячорку** віншуем з Новым 2010 годам. Трывалага здароўя, вольнасці, цяпла ад родных і блізкіх. Сябры з клуба «Спадчына».

**ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашаем у падарожжа** Прага—Дрэздэн 3—7 лютага. Т.: (017) 292–54–58.

**ПРАЦА**

**Электраманцёр шукае працу** па электрамантажы разетак, выключальнікаў, электраправодкі. Т.: (017) 294–02–02.

**СУСТРЭЧА ВЫПУСКНІКОЎ ЛІЦЭЯ**

**Сустрэча выпускнікоў** Беларускага гуманітарнага ліцэя 1992—2009 гадоў выпуску адбудзецца 15 студзеня ў 18.00. Даведкі праз т.: (029) 639–27–15. Арганізацыйныя сходы пройдуць 11 і 14 студзеня ад 17.00 да 19.00 у памяшканні ТБМ у Мінску (вул. Румянцава, 13).

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## З 2012 года свет можа перайсці на новы каляндар

Сусветная асацыяцыя календароў выступае з ініцыятывай замены цяперашняга грыгарыянскага календара. У новым календары, які прапануе асацыяцыя, тыя ж 365 дзён, аднак кожны год, які пачынаецца з нядзелі, мае адзін дадатковы дзень — другую суботу. Такая сітуацыя будзе акурат у 2012 годзе.

Экспертызу ў ААН зараз праходзіць і так званы Сіметрычны каляндар. Яго ідэя ў тым, што кожны новы месяц будзе пачынацца з панядзелка. Каб гэтага дасягнуць, трэба павялічыць да 35 колькасць дзён у лютым, траўні, жніўні і лістападзе. Колькасць дзён усіх астатніх месяцаў скарачаецца да 28. Мінус сіметрычнага календара — у выніку змяншэння колькасці дзён да 28, многія людзі пазбавяцца свайго дня нараджэння.

**СМ**

## КЕМІКІ

**Дапішы адну літару, каб выйшла новае слова**

| | |
|---|---|
| лень | пасылка |
| рама | ляск |
| вечка | рак |
| раса | рабіна |
| істота | мова |

**ВД;** **Адказы глядзі на старонцы 16.**

## Газетка дзеткам



**ЛАРЫСА ГЕНІЮШ**

НА КАНЬКАХ

Вечар, лёд у агнях,
А над елкай — месяц.
Едуць, едуць на каньках
Міхасёк з Алесем.
Бачаць хлопцы: Таня
То ўпадзе, то ўстане.

— Ой, ізноў я на баку!
Дай хутчэй, Алесь, руку.
— То трымайся, калі ласка,
Дапаможа і Міхаська.
Мы дзяўчатак анідзе
Не пакінем у бядзе.

**Больш вершаў на dzietki.org**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У наступныя дні слупок тэрмометра зноў апусціцца да мінус 20.

## Журналісты «НН» перамаглі на конкурсе імя Чаркасавай





Аўтары «Нашай Нівы» працягваюць атрымліваць пачэсныя ўзнагароды за свае працы. На гэты раз сярод трох пераможцаў конкурсу імя Веранікі Чаркасавай двое нашаніўцаў: Наталка Бабіна і Зміцер Панкавец.

Наталка Бабіна перамагла з публікацыяй «Спадарыня Лета» («НН» ад 16 сакавіка 2009 г.). Змітра Панкаўца ўганаравалі за артыкул «Ударыўся галавой у бардзюр між райаддзелам міліцыі і КДБ» («НН» ад 2 снежня). Трэцяе месца аддалі Яўгену Самсонаву за публікацыю «Як узрывалі глушылку» (часопіс «Абажур»).

Сярод найлепшых адзначаныя таксама матэрыялы аўтараў іншых выданняў: Кастуся Лашкевіча, Сяргея Чыгрына, Наталлі Семяновіч, Аляксея Белага, Андрэя Пачобута.

Падвядзенне вынікаў конкурсу адбылося напярэдадні дня нараджэння Веранікі. 12 студзеня журналістцы споўніўся б 51 год.

Конкурс ейнай памяці ГА «БАЖ» абвесціла 20 кастрычніка мінулага года, на 5-ю гадавіну з дня забойства журналісткі.

**Ул. інф.**


SVABODA.ORG

Калядныя забавы віцебскіх «маржоў».


REUTERS

**Кампанія Microsoft абагнала сваіх канкурэнтаў з Apple і першай выпусціла «вялікі IPhone» — планшэтны камп'ютар. Мікрасофтаўцы яшчэ і падсмяялі канкурэнтаў, змясціўшы адпаведную выяву на экране «планшэтніка» падчас прэзентацыі. (Apple па-англійску — яблык.)**


SVABODA.ORG

Святкаванне Вадохрышча ў Балгарыі.

COMICS_BY.LIVEJOURNAL.COM




## Конкурс кармушак для птушак

На сайце www.ruhavik.org аб'яўлены конкурс на найлепшую кармушку для птушак. Натуралісты падлічылі, што з 10 сініц узімку гінуць 8—9. Аднак, калі напаўняць некалькі кармушак хаця б раз на тыдзень, за зіму можна выратаваць сотню птушак.

А каб выйграць у конкурсе трэба:

1. Зрабіць кармушку.
2. Наляпіць на яе паперку з назвай сайта www.ruhavik.org, каб на фотаздымку можна было даведацца, што кармушка зроблена вамі.
3. Павесіць кармушку з кормам там, дзе яе агледзяць птушкі.
4. Сфатаграфаваць кармушку (найлепей — з наведнікамі).
5. Даслаць фотаздымак па электроннай пошце на kormushkiby@gmail.com да 20 лютага.

Пяць пераможцаў конкурсу атрымаюць аўтарскія экалагічныя канапляныя сумкі. Кожны ўдзельнік атрымае значак з лагатыпам акцыі. Падрабязнасці конкурсу і некалькі варыянтаў кармушак можна знайсці на сайце www.ruhavik.org

## АНЕКДОТЫ

* * *

Сына вырасціў, а ён выйшаў — дуб дубам. Затое дрэва, у прынцыпе, можна ўжо і не саджаць.

* * *

Мужчына разумее, што закаханы, калі на пару дзён губляе цікавасць да свайго аўто.

* * *

Уначы ўсе камары на адзін твар. І, на жаль, гэты твар — мой...

* * *

У антыкварнай краме.

— Цудоўныя партрэты! Хто гэтыя пані і пан у традыцыйных шляхецкіх уборах?

— Продкі, спадарыня.

— Чые продкі?

— Купіце партрэты — і будуць вашы!

* * *

Закон шоу-бізнэсу:

Чым горшы голас у спявачкі, тым менш на ёй адзежы.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Бяларучы Мінскай губ.** Прыехала ў нашы Бяларучы нейкая кабеціна-акушэрка; наняла кватэру і нават зачапіла вывеску, з добрую стальніцу, з надпісам, што тут жыве фельчарыца і акушэрка. Людзі ахвотна кінуліся да яе па раду, аж пакуль не выправіла яна на той свет аднэй кабецыны. Як толькі тая грыпнула, так і наша доктарка некуды прапала.

**«НН». №2. 1910**

**Васіль Быкаў друкуе сваю новую прыпавесць «Кошка і мышка»:**

...Мышка верыла ў дабрыню, тым болей ад такой ладнай маладой кошкі, якой яна не зрабіла нічога кепскага. Мышка разумела, што ўвогуле кошкі — ворагі мышак, але ж, думала, і кошкі бываюць розныя: злыя і добрыя. Таксама, як і мышкі. Яна во, напрыклад, зусім добрая мышка, нікому ніякага зла не ўчыніла...

Мышка да канца заставалася аптымісткай...

**«НН». №2. 2000**

**Адказы да старонкі 15:** алень, крама, авечка, краса, лістота, спасылка, бляск, косы, грак, драбінка, змова.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6300. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 12.01.2010.
Замова № 132.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
9771819161008 10002